Гос. Пуб. Биб-ка Уз.С.С.Р.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 14 (5990) | 17 студзеня 1938 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ПЕРШАГА СКЛІКАННЯ

АБ УНЯСЕННІ ЗМЕН І ДАДАТКАЎ У НЕКАТОРЫЯ АРТЫКУЛЫ КАНСТЫТУЦЫІ СССР У СУВЯЗІ З ПРЫНЯТЫМІ РАШЭННЯМІ ЦВК І СНК СССР

З ДАКЛАДА ДЭПУТАТА А. Ф. ГОРКІНА

Тазарышы, пасля прыняцця Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездам Советаў новай Канстытуцыі СССР, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў СССР прынялі пастановы, у сувязі з якімі, а таксама ў сувязі з тым, што некаторыя саюзныя рэспублікі паставілі пытанне аб стварэнні ў іх складзе абласцей, — вынікае неабходнасць унясення змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі СССР.

Я пачну сваё зыкладанне з главы II Канстытуцыі СССР, якая прысвечана пытанням дзяржаўнага ўпарадкавання СССР.

У артыкуле 14 Канстытуцыі СССР сказана, што вядзенню Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік у асобе яго вышэйшых органаў улады і органаў дзяржаўнага кіравання падлягае «зацвярджэнне ўтварэння новых краёў і абласцей, а таксама новых аўтаномных рэспублік у складзе саюзных рэспублік» (пункт «Е»).

У адпаведнасці з гэтым артыкулам Канстытуцыі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР у розны час прыняў некалькі пастаноў аб раздзяленні краёў і абласцей, уваходзіўшых у склад РСФСР і УССР.

Гэтыя пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР аб раздзяленні абласцей і краёў выкліканы неабходнасцю наблізіць кіраўніцтва абласных совецкіх органаў да раёнаў, да прадпрыемстваў, МТС, калгасаў і соўгасаў, зрабіць кіраўніцтва абласных совецкіх органаў больш канкрэтным, забяспечыць добрае веданне і больш быстрае зырашэнне практычных пытанняў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Бурны рост народнай гаспадаркі, рост гарадоў, МТС і калгасаў у вёсцы, рост культуры і матэрыяльнай забяспечанасці працоўных, павышэнне палітычнай актыўнасці і свядомасці мас — усё гэта прад'яўляе і больш высокую патрабавальнасць да кіраўніцтва з боку совецкіх органаў. Задачы кіраўніцтва значна ўскладняюцца.

Трэба таксама адзначыць і такі першаступенны важнасці факт, як рост кадраў за ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Раздзяленне абласцей і краёў палягчае работу для новых кадраў, якія вылучаны на розных участках сацыялістычнага будаўніцтва. Пры раздзяленні абласцей лягчэй ахапіць складаныя задачы палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця гарадоў, сёл, прадпрыемстваў, калгасаў. З другога боку, такое пераўтварэнне абласцей і краёў забяспечвае і больш быстрае вылучэнне новых кадраў на кіруючую совецкую, гаспадарчую і культурную работу.

Я не магу пералічыць асаблівасцей усіх краёў і абласцей, якія рашэннем Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР былі раздзелены. Я абмяжуюся толькі характарыстыкай некаторых з іх.

Да раздзялення Заходне-Сібірскага края на Новасібірскую вобласць і Алтайскі край, тэрыторыя края складала 900 тысяч квадратных кілометраў. У сваім складзе Заходне-Сібірскі край меў 122 раёны, 2.326 сельсоветаў. Насельніцтва края складала 6.330 тыс. чалавек, у тым ліку — 1.900 тысяч гарадскога насельніцтва. Пасеўная плошча Заходне-Сібірскага края складала 6.600 тысяч га, у тым ліку 5.400 га пасеўнай плошчы калгасаў і каля 1 мільёна га соўгасаў. На тэрыторыі края к пачатку 1937 года было 229 МТС. У Заходне-Сібірскім краі да раздзялення было 7.350 школ, 65 тэхнікумаў, 12 ВНУ.

Пасля раздзялення края, у Новасібірскай вобласці налічэцца 57 раёнаў, 1.257 сельсоветаў, каля 4 мільёнаў насельніцтва. У Алтайскім краі, апрача Ойроцкай аўтаномнай вобласці, налічваецца 55 раёнаў, 954 сельсоветы. У краі — звыш 2,3 мільёна насельніцтва.

Адсюль відаць, наколькі неабходна было раздзяленне Заходне-Сібірскага края.

Азова-Чорнаморскі край да раздзялення яго на Растоўскую вобласць і Краснадарскі край меў тэрыторыю ў 182 тыс. квадратных кілометраў, яднаў 133 раёны, 1.212 сельсоветаў. У краі налічвалася каля 6 мільёнаў насельніцтва, у тым ліку 2.105 тысяч гарадскога. Пасеўная плошча Азова-Чорнаморскага края складала 7.700 тысяч га, у тым ліку 6 мільёнаў га пасеваў калгасаў і 1.400 тыс. га соўгасаў. На тэрыторыі Азова-Чорнаморскага края к пачатку 1937 года было 291 МТС. У краі было 4.829 школ, 83 тэхнікумы і 29 ВНУ.

Пасля раздзялення Азова-Чорнаморскага края на Растоўскую вобласць і Краснадарскі край, Растоўская вобласць яднае 61 раён, з 2.821 тыс. насельніцтва і Краснадарскі край (апрача Адыгейскай аўтаномнай вобласці) яднае 66 раёнаў з 2.993 тыс. насельніцтва.

Дастаткова гэтых прыкладаў, каб паказаць усю неабходнасць і мэтазгоднасць раздзялення гэтых краёў і абласцей на новыя вобласці.

У адпаведнасці з гэтымі зменамі ў абласным будаўніцтве РСФСР вынікае неабходнасць унясення змен і дадаткаў у адпаведныя артыкулы Канстытуцыі СССР.

У складзе Украінскай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі былі таксама ўтвораны новыя вобласці.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта УССР аб разбуйненні абласцей, зацверджаная Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам СССР, мае сваёй мэтай, побач з задачай паляпшэння кіраўніцтва гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, паляпшэнне кіраўніцтва справай умацавання совецкіх граніц.

На зацвярджэнне Вярхоўнага Совета СССР прадстаўляецца прапанова аб утварэнні ў складзе УССР новых абласцей — Жытомірскай, Каменец-Падольскай, Нікалаеўскай і Палтаўскай. У адпаведнасці з гэтым на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета ўносяцца адпаведныя змены артыкула 23 Канстытуцыі СССР.

У апошні час Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Узбекскай ССР і Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР прынялі пастановы аб утварэнні абласцей у складзе гэтых рэспублік.

Ва Узбекскай ССР, па рашэнню Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Узбекскай ССР, якое прадстаўляецца на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета, мяркуецца утварэнне наступных абласцей: Бухарскай, Самаркандскай, Ташкенцкай і Ферганскай. Мяркуецца таксама пераўтварыць Харэзмскую округу ў Харэзмскую вобласць.

У Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы па пастанове Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР, якая прадстаўляецца на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета, мяркуецца ўтварэнне наступных абласцей: Віцебскай, Гомельскай, Менскай, Магілеўскай і Палескай.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Казахскай ССР прыняў пастанову і прадстаўляе яе на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета аб раздзяленні Заходне-Казахстанскай вобласці на Заходне-Казахстанскую і Гур'еўскую, Паўднёва-Казахстанскай — на Паўднёва-Казахстанскую і Кзыл-Ордынскую і Усходне-Казахстанскай — на Усходне-Казахстанскую і Паўладарскую вобласці.

Стварэнне абласцей у Беларускай і Узбекскай ССР, раздзяленне існуючых абласцей у Казахскай ССР з'яўляецца буйнейшым мерапрыемствам у справе дзяржаўнага ўпарадкавання гэтых рэспублік і СССР.

Змены, якія вынікаюць з рашэнняў Цэнтральных Выканаўчых Камітэтаў Узбекскай ССР, Беларускай ССР і Казахскай ССР, датычаць 26, 28 і 29 артыкулаў Канстытуцыі.

Вось тыя змены і дадаткі, якія ўносяцца на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета да артыкулаў II главы Канстытуцыі СССР.

* * *

Наступны дадатак прапануецца ўнесці ў артыкул 49 Канстытуцыі, глава III, у якім гаворыцца аб вышэйшых органах дзяржаўнай улады Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Артыкул 49 Канстытуцыі трактуе пытанні кампетэнцыі Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Я агалашу тэкст дадатка да артыкула 49, які прапануецца на абмеркаванне і зацвярджэнне Вярхоўнага Совета: Прэзідыум Вярхоўнага Совета —

«III) Абвяшчае ў асобных мясцовасцях або па ўсяму СССР ваеннае становішча ў інтарэсах абароны СССР або забяспечання грамадзкага парадку і дзяржаўнай бяспечнасці».

Прадстаўленне Прэзідыуму Вярхоўнага Совета СССР права абвяшчаць ваеннае становішча дыктуецца інтарэсамі забяспечання абароны СССР, грамадзкага парадку і дзяржаўнай бяспечнасці. Яно вынікае з абавязкаў і правоў вышэйшага органа дзяржаўнай улады СССР гарантаваць бяспечнасць сацыялістычнай краіны ва ўмовах капіталістычнага акружэння.

Наступныя змены і дадаткі датычаць артыкулаў главы V Канстытуцыі СССР, у якой гаворыцца аб органах дзяржаўнага кіравання Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Гэтыя змены і дадаткі вынікаюць з прынятых Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам і Советам Народных Камісараў СССР пастаноў.

22 жніўня 1937 года Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў СССР прынялі пастанову аб падзеле Народнага Камісарыята Цяжкай Прамысловасці. Са складу Народнага Камісарыята Цяжкай Прамысловасці былі вызелены заводы аўтатрактарныя, станкабудаўнічыя, паравоза-вагонабудаўнічыя, заводы сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, катлатурбінная і электратэхнічная прамысловасць і іншыя галіны машынабудаўнічай прамысловасці, якія ў даны момант яднаюцца асобным агульнасаюзным Народным Камісарыятам Машынабудаўніцтва.

Машынабудаўніцтва — гэта ключ да рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Партыя і ўрад аддаюць асаблівую ўвагу гэтай галіне прамысловасці. Машынабудаўніцтва з'яўляецца асновай тэхнічнага пераўзбраення прамысловасці, усёй сельскай гаспадаркі і транспарта.

Неабходнасць стварэння Народнага Камісарыята Машынабудаўніцтва вынікае з велізарнага росту гэтай важнейшай галіны прамысловасці.

Прамысловая прадукцыя машынабудаўніцтва ў 1936 годзе выражалася ў суме 20.764 млн. руб. Калі параўнаць з 1913 годам, то атрымліваецца павелічэнне ў 28 разоў.

Прадукцыя сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва разам з трактарамі ў 1936 годзе выражалася ў суме 2.260,8 млн. рублёў.

Ростам машынабудаўнічай прамысловасці і абумоўліваецца пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў СССР аб стварэнні асобнага агульнасаюзнага Народнага Камісарыята Машынабудаўніцтва.

30 снежня 1937 года Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў СССР прынялі пастанову аб стварэнні агульнасаюзнага Народнага Камісарыята Ваенна-Морскага флота.

Совецкі Саюз у сэнсе абароназдольнасці гатоў да ўсякіх нечаканасцей. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія аснашчана ўсімі сучаснымі сродкамі абароны.

Наркамат Абароны нямала зрабіў у адносінах умацавання ваенна-морскіх сіл СССР. Уласкзаналенне гаспадаркі ваенна-морскага флота, яго ўзрастанне, выключнае значэнне ваенна-морскага флота ў справе абароны краіны, маючай незбяжныя морскія граніцы, патрабавалі выдзялення ваенна-морскіх сіл з Народнага Камісарыята Абароны ў самастойны Наркамат Ваенна-Морскага флота.

Уносіцца на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета дадатак да артыкула 77 Канстытуцыі СССР, у якой пералічваюцца агульнасаюзныя наркаматы, у сувязі з пераўтварэннем Камітэта па загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў пры СНК СССР у агульнасаюзны Народны Камісарыят Загатовак.

1 снежня 1935 года на нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак таварыш Сталін паставіў задачу — рыхтавацца да таго, каб давесці ў бліжэйшы будучы, годы праз тры-чатыры, штогодную вытворчасць хлеба да 7—8 мільярдаў пудоў. Да ажыццяўлення гэтай задачы мы фактычна падышлі ўжо ў 1937 годзе.

Вытворчасць усіх галін сельскай гаспадаркі ў мінулым годзе дала ў два разы больш прадукцыі, чым давала сельская гаспадарка царскай Расіі да вайны.

Матэрыяльныя рэсурсы дзяржавы ўзрастаюць, павялічваецца тэхнічная база для захоўвання гэтых прадуктаў. Значэнне сельскагаспадарчых загатовак, у сувязі з ростам прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы, узрастае і ў сувязі з гэтым з'яўляецца мэтазгодным стварэнне больш магутнага загатоўчага апарата пад кіраўніцтвам агульнасаюзнага Наркамата загатовак.

У адпаведнасці са стварэннем новых камісарыятаў у артыкул 77 прапануецца ўнесці наступныя дадаткі: да агульнасаюзных наркаматаў дабавіць Народныя камісарыяты машынабудаўніцтва, ваенна-морскага флота і загатовак.

Артыкул 70 Канстытуцыі СССР прапануецца дапоўніць словамі — «Старшыня праўлення дзяржаўнага банка».

Уносіцца прапанова аб уключэнні старшыні праўлення дзяржаўнага банка ў склад Совета Народных Камісараў СССР.

І, нарэшце, апошняя заўвага. Уносіцца прапанова змяніць найменаванне Народнага камісарыята ўнутранага гандля, назваўшы яго — Народны камісарыят гандля.

У адпаведнасці з гэтым у артыкуле 78 Канстытуцыі прапануецца слова — «унутранага гандля» замяніць словам «гандля».

У артыкуле 83 Канстытуцыі СССР прапануецца слова «Ўпаўнаважанага камітэта загатовак» выключыць і словы «ўнутранага гандля» замяніць словам «гандля».

Вось тыя змены і дадаткі да некаторых артыкулаў Канстытуцыі СССР, якія прадстаўляюцца на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік. **(Апладысменты).**

ГІСТАРЫЧНЫЯ РАШЭННІ

Аб'яднанае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, якое адбылося 15 студзеня, з'яўляецца надзвычайна зажнай падзеяй у жыцці нашай краіны. На гэтым пасяджэнні прыняты рашэнні, якія набываюць велізарнае значэнне ў справе нашага далейшага пераможнага руху ўперад.

Вярхоўны Совет СССР унёс рад змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі СССР, дадаткаў, вынікаючых з узросшых задач сацыялістычнага будаўніцтва, з росту, умацавання, удасканалення совецкага ладу. Рашэнні, прынятыя Вярхоўным Советам СССР, — вышэйшым органам дзяржаўнай улады, — павінны яшчэ больш умацаваць сувязь партыі і совецкай улады з шырокімі народнымі масамі, наблізіць дзяржаўны апарат да раёна, сяла і вёскі.

У прынятых Сесіяй зменах і дадатках знайшлі сваё яркае адлюстраванне велізарны рост магутнасці сацыялістычнай краіны, рост народнай гаспадаркі і культуры ў Совецкім Саюзе.

У сваёй прамове на аб'яднаным пасяджэнні абодвух палат совецкага парламента, прысвечанай абгрунтаванню некаторых змен і дадаткаў да Канстытуцыі СССР, старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР дэпутат В. М. Молатаў прывёў рад яркіх пераканаўчых лічбаў, якія выклікаюць пачуццё радасці і гордасці ў кожнага совецкага грамадзяніна, кожнага патрыёта сацыялістычнай радзімы. Наша цудоўная краіна расце і квітнее з кожным годам. Пад жызнетворчымі праменнямі сацыялізма хутка растуць і развіваюцца ўсе галіны народнай гаспадаркі і культуры. Машынабудаўніцтва—асноўная база тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі—толькі за перыяд двух сталінскіх пяцігодак узрасло ў 13,5 раза. Узлым сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, рост заможнасці калгаснага сялянства знаходзіць яркае адлюстраванне ў росце сельскагаспадарчых загатовак. Калгасны лад, як адзначыў тав. В. М. Молатаў, прыносіць ужо свае першыя спелыя плады. За апошнія 9 год загатоўкі аднаго толькі зярна павялічыліся ў 2,5 раза. У гэтай лічбе ўвасоблены вялікія поспехі калгасаў у барацьбе за сталінскія ўраджаі, перамогі стаханаўцаў — энтузіястаў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Тав. В. М. Молатаў прывёў лічбы, якія з'яўляюцца сапраўднай сімфоніяй перамог сацыялізма. Абароты Дзяржаўнага банка (без унутрыбанкаўскіх разлікаў) узраслі за апошнія 8 год у 13 разоў і дасягнулі гігантскай лічбы звыш 2 трыльёнаў рублёў. Бюджэт краіны Советаў за 9 год вырас у 13 разоў і складае, па папярэдніх падліках, 101 мільярд рублёў «Дзяржаўны бюджэт і фінансавыя абароты Дзяржаўнага банка, як люстра адбіваюць тое, што ў нас адбываецца ў краіне Советаў, у простых лічбах, праўда, лічбах даволі салідных, даволі ўнушальных, даволі аўтарытэтных...». (Молатаў).

Вялікі рост народнай гаспадаркі, гігантскі рост маштабаў работы, узлым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню і патрабаванняў працоўных мас выклікаюць новыя складаныя задачы, выклікаюць неабходнасць раду арганізацыйных мер па паляпшэнню кіраўніцтва, па яшчэ большаму задаволенню запросаў насельніцтва.

Вось чаму Сесія аднадушна зацвердзіла змены і дадаткі да 22, 23, 26, 28 і 29 артыкулаў Канстытуцыі СССР, якія датычаць арганізацыйна-адміністрацыйнага падзелу абласцей і краёў неасяжнай краіны Советаў, утварэння новых абласцей у саюзных рэспубліках. Гэта рашэнне цалкам прадыктавана патрабаваннямі совецкай дэмакратыі, сталінскімі клопатамі аб лепшым абслугоўванні патрэбаў насельніцтва, большым задаволенні яго жыццёвых інтарэсаў.

У Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, згодна рашэння Вярхоўнага Совета СССР, утвараюцца 5 абласцей: Віцебская, Гомельская, Менская, Магілеўская і Палеская.

Гэта пастанова мае для БССР — фарпоста Совецкага Саюза на рубяжы з капіталістычным захадам — выключнае значэнне. Утварэнне абласцей яшчэ больш умацуе сацыялістычную гаспадарку БССР, нашы калгасы і соўгасы, яшчэ больш наблізіць апарат да мас. Гэта пастанова выклікана вялікім палітычным і эканамічным ростам Совецкай Беларусі, стаўшай перадавой, квітнеючай індустрыяльна-калгаснай краінай.

Дзве лічбы выразна паказваюць, якіх гігантскіх поспехаў дабілася Совецкая Беларусь пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа: у 1913 г. прамысловасць БССР дала прадукцыі на 89 мільёнаў руб. У 1937 г. валавая прадукцыя сацыялістычнай прамысловасці дасягнула 2.100 мільёнаў рублёў.

Выходзячы з неабходнасці дыферэнцыяцыі дзяржаўнага кіраўніцтва, Сесія зацвердзіла таксама ўтварэнне агульнасаюзных народных камісарыятаў — машынабудаўніцтва і загатовак.

З вялікім уздымам і велізарным энтузіязмам прыняла Сесія пастановы аб утварэнні Народнага Камісарыята ваенна-марскога флота і аб дапаўненні артыкула 49 Сталінскай Канстытуцыі ўказаннем на права прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР уводзіць ваеннае становішча там, дзе гэта будзе неабходна.

Значэнне гэтага дадатку зусім яснае. Яго, бясспрэчна, сустрэне з поўным адабрэннем уся наша краіна.

Магутная караючая рука сацыялістычнай дзяржавы разатрэ ў парашок трацкісцка-бухарынскую погань, якая паспрабуе скарыстаць ваенную небяспеку для сваіх подлых злачынных спраў.

Дэпутаты совецкага парламента — лепшыя людзі Совецкай краіны, выражаючы волю вялікага народа, горача падтрымалі мірную палітыку Совецкага ўрада, заснаваную на непахіснасці і магутнасці Совецкага ладу, палітыку, якая абапіраецца на несакрушальную сілу моцнай сваёй сувязі з народам, адзінай у свеце Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-марскога флота. Выбраннікі шматнацыянальнага совецкага народа дэманстравалі перад усім светам сваю гарачую любоў да радзімы, патрыятызм лепшых совецкіх людзей, гатоўнасць усямерна абараняць цудоўную сацыялістычную краіну. Бурнымі авацыямі ў гонар лепшага друга совецкіх народаў, вялікага тварца Канстытуцыі таварыша Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў—главы совецкага ўрада таварыша Молатава, жалезнага наркома абароны таварыша Варашылава і кіраўніка слаўнай Совецкай разведкі таварыша Ежова дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР дэманстравалі гатоўнасць нястомна мацаваць абароназдольнасць СССР — цытадэлі сусветнай пролетарскай рэвалюцыі, знішчаць гнусных лазутчыкаў фашысцкіх ахранак — трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, рыхтаваўшых напад агрэсараў на краіну Советаў.

У сваёй выдатнай прамове на аб'яднаным пасяджэнні абодвух палат тав. В. М. Молатаў выказаў агульную думку ўсяго совецкага народа, заявіўшы:

«...Нам патрэбна моцная Чырвоная Армія і нам патрэбен моцны ваенна-марскі флот. У магутнай совецкай дзяржавы павінен быць адпавядаючы яе інтарэсам, дастойны нашай вялікай справы, марскі і акіянскі флот».

Вялікая сацыялістычная краіна будзе мець ваенны флот, дастойны яе магутнасці!

У Совецкай краіны ёсць што абараняць, каму абараняць і чым абараняць! Няхай зарубяць сабе гэта на насу фашысцкія падпальшчыкі вайны, якія шалёна рыхтуюцца да новых авантур.

Рашэнні Сесіі Вярхоўнага Совета СССР натхняюць працоўных нашай краіны на новыя перамогі, новыя подвігі ва славу радзімы, ва славу вялікай партыі, Леніна—Сталіна, якая вядзе народы СССР да светлых вяршынь чалавечага шчасця, да комунізма.

НЕПАРУШНАЯ СУВЯЗЬ ДЭПУТАТАЎ З ВЫБАРШЧЫКАМІ

МАСКВА, 16 студзеня. **(Па тэлефону ад спец. кар. «Звязды»).** Прымаючы ўдзел у работах Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, вырашаючы зажнейшыя дзяржаўныя пытанні, дэпутаты адначасна не прарываюць штодзённай сувязі з сваімі выбаршчыкамі. Штодня яны пішуць ім аб ходзе работ Сесіі і ў адказ атрымліваюць дзесяткі і сотні пісем і тэлеграм.

Дэпутат Совета Саюза Герой Совецкага Саюза тав. Дзянісаў у першы дзень адкрыцця Сесіі паслаў тэлеграму сваім выбаршчыкам, у якой з вялікім захапленнем падзяліўся з імі сваімі радаснымі ўражаннямі аб сустрэчы з правадыром.

Тав. Дзянісаў атрымаў прывітальную тэлеграму ад выбаршчыкаў—курсантаў і камандзнага састава курсаў падрыхтоўкі лейтэнантаў. Яны просяць перадаць ад іх імя баявое прывітанне вялікаму Сталіну і запэўніць яго, што будуць дастойнымі камандзірамі непераможнай Чырвонай Арміі.

Дэпутат Совета Саюза, стаханавец Гомсельмаша тав. Альтшулер паслаў пісьмо рабочым свайго дрэваапрацоўчага цэха.

Ён падзяліўся сваімі ўражаннямі ад Сесіі і паставіў перад сваімі таварышамі канкрэтныя задачы па павышэнню прадукцыйнасці працы. «Прашу вас, сябры, — пісаў ён, — не падвядзіце мяне, працуйце так, як абяцалі перад маім ад'ездам,— у дні работы Сесіі дабіцца асабліва высокіх паказальнікаў. Я ў сваю чаргу абяцаю, як дэпутат, выбраны народам, з гонарам апраўдаць яго давер'е».

Тэлеграма з пажаданнем плённай работы ў Вярхоўным Совеце прышла на адрас дэпутата Совета Нацыянальнасцей тав. Іванова А. І. ад рабочых магілеўскай гарбарні імя Сталіна, дзе нядаўна працаваў тав. Іваноў.

Р. ДОДЗІН.

ДА ВЕДАМА РЭДАКТАРАЎ РАЁННЫХ, ГАРАДСКІХ, АКРУГОВЫХ І РЭСПУБЛІКАНСКІХ ГАЗЕТ

ЦК КП(б)Б 23 студзеня гг., у 12 гадзін дня, у гор. Менску склікае рэспубліканскую нараду рэдактараў раённых, гарадскіх, акруговых і рэспубліканскіх газет.

У парадку дня —

Вынікі і вопыт работы рэдакцый газет у час выбараў у Вярхоўны Совет СССР і далейшыя задачы друку.

Нарада адбудзецца ў зале пленумаў ЦК КП(б)Б.

ЦК КП(б)Б.

З ВЕЛІЗАРНЫМ УЗДЫМАМ СУСТРЭЛІ ПРАЦОЎНЫЯ БССР РАШЭННІ СОВЕЦКАГА ПАРЛАМЕНТА

Яшчэ больш умацуем абароназдольнасць СССР

На менскай гарбарні «Большэвік» учора з вялікім уздымам прайшоў агульназаводскі мітынг, прысвечаны прамове старшыні СНК СССР таварыша В. М. Молатава на Сесіі Вярхоўнага Совета і рашэнням Сесіі.

Слова ўзяў стары рабочы-стаханавец першага хромавага цэха т. Аропкер Ш.

— Урад СССР, — сказаў ён, — вядзе паслядоўную палітыку міру і не паддаецца на правакацыі фашысцкіх агрэсараў. Але мы павінны быць заўсёды гатовымі да таго, каб разграміць любую спробу ворага парушыць нашае мірнае будаўніцтва. І зусім праў глава совецкага ўрада Вечаслаў Міхайлавіч Молатаў, калі ён заявіў, што нам неабходна падняць яшчэ вышэй абароназдольнасць нашай краіны, яшчэ больш умацаваць абарону наземных граніц і морскіх берагоў Совецкага Саюза.

У сваёй рэзалюцыі агульназаводскі мітынг калектыва завода «Большэвік» цалкам і поўнасцю далучаецца да рашэнняў першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

ВІТАЕМ РАШЭННІ СОВЕЦКАГА ПАРЛАМЕНТА!

Учора газеты прынеслі нозыя радасныя паведамленні аб рашэннях Вярхоўнага Совета СССР. На Сесіі выступіў глава совецкага ўрала, бліжэйшы саратнік вялікага Сталіна тазарыш Молатаў.

Калі першая змена менскага станкабудаўнічага завода імя Кірава скончыла работу, рабочыя, служачыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі прышлі на мітынг у прасторны, заліты святлом новы механічны цэх. Сабралося звыш 600 чалавек. Нязвычайная цішыня ўсялілася ў заўсёды шумным пэху. Усе ўзажліва слухаюць чытанне прамовы старшыні СНК СССР, дэпутата таварыша В. М. Молатава. Чытанне прамовы не раз перарываецца бурнымі воплескамі. Усе горача вітаюць зыказванне таварыша Молатава аб неабходнасці яшчэ большага ўмацавання магутнасці СССР і стварэнні Наркамата ваенна-марскога флота. З вялікай цікавасцю заслухзаюцца рашэнні Сесіі і прамова дэпутата, выконваючага абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. Волказа.

У прынятай рэзалюцыі калектыў рабочых завода імя Кірава горача вітае главу совецкага ўрада таварыша В. М. Молатава і рашэнне першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР аб утварэнні пяці абласцей у БССР.

Н. Г.

У нас ёсць што абараняць, ёсць чым абараняць і ёсць каму абараняць

Байцы і камандзіры ўсіх падраздзяленняў часці, дзе камісарам тав. Васільеў, з вялікай цікавасцю сочаць за работаю першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Як толькі былі атрыманы газеты, у якіх была надрукавана прамова старшыні СНК СССР дэпутата тав. В. М. Молатава, ва ўсіх падраздзяленнях адбыліся калектыўныя чытанні гэтай прамовы.

З вялікім уздымам і палітычнай актыўнасцю сустрэлі зыдатную прамову главы совецкага ўрада тав. Молатава байцы падраздзялення, якім камандуе старшы лейтэнант тав. Валейша.

— Стварэнне Наркамата ваенна-марскога флота, — сказаў на мітынгу чырвонаармеец тав. Сцяпанаў, — яшчэ больш умацуе незломную сілу нашай Чырвонай Арміі і абароназдольнасць нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

Мітынгі на фабрыках і заводах Магілева

МАГІЛЕЎ, 16 студзеня. **(Па тэлефону).** На прадпрыемствах Магілева сёння адбыліся мітынгі, прысвечаныя гістарычнаму рашэнню вышэйшага органа ўлады.

На мітынгу рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў аўтарамонтнага завода імя Кірава, выступіў намеснік начальніка цэха № 1 тав. Клябцоў.

Работніца-стаханаўка цэха № 1 тав. Мінкіна заявіла:

— Стварэнне Магілеўскай вобласці будзе спрыяць яшчэ больш бурнаму індустрыяльнаму і культурнаму росту Магілеўшчыны.

Ад імя ўсіх рабочых цэха зыношу шчырую падзяку тварцу самай дэмакратычнай Канстытуцыі ў свеце таварышу Сталіну, які няспынна клапоціцца аб росквіце нашай Беларускай ССР.

Калектыў шаўковай фабрыкі імя Куйбышэва адказаў на рашэнне Сесіі Вярхоўнага Совета новымі вытзорчымі перамогамі. У гэты дзень асабліва добрыя паказальнікі дасягнуты ў палепшанні якасці прадукцыі. Сёння план выпуску шоўку першага сорту выканан на 108 проц.

ЗАГЕР, ФАРБЕР.

НАВЕСЦІ БОЛЬШЭВІЦКІ ПАРАДАК У МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ МАИСТЭРНЯХ

ЧАМУ ЗРЫВАЕЦЦА РАМОНТ ТРАКТАРОЎ

Веснавую і ўборачную кампаніі мінулага года Грэская МТС правяла вельмі дрэнна. Прычына: рамонт трактараў быў праведзен па-шкодніцку. Здавалася-б, што новаму кіраўніцтву МТС і яе дырэктару т. Жыдовічу трэба было зрабіць для сябе з гэтага сур'ёзныя вывады. На справе-ж далёка не так.

Самыя складаныя сельскагаспадарчыя машыны звалены на двары МТС у кучу. Частка трактараў, сеялак, дыскавыя бароны замецены снегам. Сям-там з-пад снегу тырчаць ражны калёс, культыватараў. Стаяць пад адкрытым небам прывады камбайнаў. Гніюць і ржавеюць каштоўныя павозкі.

Рамонт трактарнага парку знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Для рамонту трактараў нехапае шмат запасных частак. Пры належным стараанні гэтыя часткі можна было-б даўно набыць і трактарны парк прывесці ў баявую гатоўнасць. Але бязгдзейнасць кіраўніцтва прывяла да таго, што да пачатку рамонту не было набыта ні адной запаснай часткі. У выніку гэтага, 12 трактараў «ХТЗ» ляжаць палы месяц разабранымі, а 2 трактары «Інтэрнацыянал» і тры «ЧТЗ» ужо больш двух месяцаў валяюцца параскіданымі.

За рамонт ніхто не нясе адказнасці. З гэтай прычыны пры напрасоўцы валу часта разбіваюцца новыя падшыпнікі (за час рамонту разбіты 4 шт.). У рэзультаце адсутнасці тэхнічнага нагляду з боку механікаў, пры пагрузцы матора на машыну абламалі заднюю балку матора з трактара «ХТЗ». Пры абкатцы трактараў былі 2 паломы паршнёў. Усё гэта значна павялічвае кошт рамонту.

Работа ў МТС арганізавана дрэнна. Нарады на работу не вылаюцца. Няма норм выпрацоўкі. Колькі хто зарабіў і як улічваецца праца — пра гэта ніхто з рабочых не ведае. Улік працы запушчан. Учотчыкам тут працуе нехта Сцепановіч, які сумысля заблытвае ўчот працы. Каб выклікаць незадаваленне, Сцепановіч не ўлічвае трактарыстам выкананай работы. Так, трактарысту Васілю Пісарыку ён не ўлічыў за падгонку аднаго камплекта калец, за рамонт двух утулак і інш. Для таго, каб Сцепановіч улічыў выкананую работу, брыгадзіру рамонтнай брыгады Салатаву давялося два дні хадзіць за Сцепановічам. З прычыны дрэннага ўліку, трактарысту Антосю Гурыновічу не залічана за 2 тыдні працы.

Такая школніцкая дзейнасць у пастаноўцы ўчоту працы можа разбурыць працоўную дысцыпліну. Многія трактарысты адмаўляюцца ісці на рамонт, а то і зусім пакідаюць працу. За час рамонту пакінула працу пяць трактарыстаў. Брыгада Пісарыка зусім развалілася, астаўся толькі брыгадзір.

Матэрыяльныя ўмовы трактарыстаў надзвычай дрэнныя. Памяшканне майстэрні цеснае, без вентыляцыі. Пры заводзе трактара памяшканне напаўняецца шкоднымі, атручваючымі газамі, дымам, якія падрываюць здароўе трактарыстаў і перашкаджаюць нармальнай рабоце. У інтэрнатах холодна, брудна, сыра.

Сепыялістычнае спаборніцтва не арганізавана. Лепшых трактарыстаў, як Нямковіча Рыгора і другіх, сустракаюць у штыхі.

Прывезенае гаворыць аб тым, што ў Грэскай МТС ворагі не выкрыты, яны ўсякімі мерамі стараюцца сарваць рамонт трактараў.

На пасадзе загадчыка гаспадаркай увесь час працуе ўсім вядомы жулік Карпучок, які некалькі раз судзім за крадзёж і разбазарванне калгаснай маемасці. Карыстаючыся палітычнай бясклопатнасцю кіраўнікоў МТС, Карпучок падрабляе грашовыя дакументы, а пасля на гэтыя грошы п'янствуе. У гэтай школнай справе Карпучку старанна дапамагае старшы бухгалтар Жукоўскі, які атрымлівае ад Карпучка фіктыўныя дакументы і праводзіць іх па кнігах.

Усе гэтыя справы творацца на вачах дырэктара Жыдовіча. Але апошні па выкрыцці гэтых агіднасцей нічога не робіць і патурае школнікам.

А. ЯЛЬНІЦКІ.

НЕПАРАДКІ Ў ДРЫБІНСКАЙ МТС

Кіраўніцтва Дрыбінскай МТС да гэтага часу не ліквідавала вынікаў шкодніцтва. Ужо некалькі год як арганізавана Дрыбінская МТС, і ўсё яшчэ няма памяшкання, дзе можна было-б у зімовых умовах рамонтаваць трактары. Рамонт праводзіцца пад халоднай, з усіх бакоў пранізваемай ветрам, павеццю. Для таго, каб адвінціць гайку ці падладзіць якую-небудзь дэталь, неабходна рамонтуемую рэч разаграваць спіртавой лямпай. Падагрэты метал пакрываецца густым пластом наносу і хутка астывае, што не дае магчымасці праводзіць рамонт. Гайкі на марозе не адвінчваюцца, а ламаюцца.

З-за холаду рамонтныя рабочыя і механікі ўдзень працуюць не больш $1^1/_2$ — 2 гадзіны. Прапавань прыходзіцца ў рукавіцах. Такія ўмовы работы пагражаюць своечасовамy сканчэнню рамонту трактараў і іншых сельгасмашын.

Трактарысты і механікі не раз звярталіся да дырэктара МТС і намесніка дырэктара, каб яны палепшылі ўмовы работы, але ніякіх мер не прынята. Між тым ёсць усе магчымасці стварыць добрыя ўмовы для рамонту трактараў. МТС перадана сядзіба ліквідаванага соўгаса «Ротэ фане», але дырэкцыя МТС адклаўвае прыём яе і да гэтага часу не палумала аб скарыстанні пад рамонтныя майстэрні вельмі добрых памяшканняў былога соўгаса.

Такія паводзіны дырэкцыі МТС, не без падставы, выклікаюць падазронасць у рабочых трактарнай станцыі. Падобна на тое, што дырэкцыя не жадае ліквідаваць вынікі шкодніцтва.

Механік МТС т. Тышчанка справядліва папракае Дрыбінскі райком партыі (сакратар т. Турык), што райком дасюль не знайшоў часу, каб пацікавіцца рамонтам трактараў. Ніхто з кіруючых работнікаў раёна ні разу не быў у МТС, хоць яна знаходзіцца ад райкома і райвыканкома за 100 метраў і кіраўнікі раёна кожны дзень праходзяць міма МТС.

Частка машын і трактараў МТС засыпана снегам. Для таго, каб іх адрамантаваць, трэба патраціць многа часу на раскопкі. Кіраўніцтва МТС не клапоціцца аб сваіх трактарыстах. Да гэтага часу ім не выплачана за работу 19 тысяч рублёў і звыш 30 тон хлеба. Зразумела, што запяжка разліку з трактарыстамі не стымулюе развіццю стаханаўскага руху.

У раёне арганізоўваецца другая МТС, але да гэтага часу па стварэнню яе нічога не зроблена. МТС мае толькі дырэктара, а няма агранома, трактарыстаў і механікаў. Няма яшчэ ні аднаго трактара і тары для вывазкі гаручага. Арганізацыяй новай МТС, падборам кадраў для яе Наркамзем БССР яшчэ не заняўся. Не аказваецца ніякай дапамогі і нованазначанаму дырэктару.

І. Ч.

РЫХТУЕМСЯ ДА ВЯСНЫ

З вялікай радасцю і ўздымам нашы калгаснікі падводзяць вынікі мінулага года. У адзнаку першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР мы ўзялі на сябе абавязацельствы дабіцца ў 1938 годзе яшчэ вышэйшага ўраджаю, значна больш падняць вагу працадня калгасніка. У адказ на зварот перадавых калгаснікаў і рабочых МТС рэспублікі ў калгасе разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу большэвіцкай вясны першага года трэцяй сталінскай пяцігодкі.

Наша першае абавязацельства — пасеяць усе яравыя выключна на ўгноенай глебе. Для гэтага да вясны звозім на поле 1.500 тон торфу, 2.500 тон гною, збіраем 20 тон попелу, 8 тон курынага памёту, вывозім 60 тон мінеральнага ўгнаення.

Да гэтага часу ў нашым калгасе ўжо вывезена 410 тон торфу. Гэты торф, разам з гноем, складаецца на полі ў кампосныя кучы. Гною вывезена 250 тон. На станцыі забралі 40 тон мінеральных угнаенняў і захавалі яго ў сухім месцы.

Перадавой па вызазцы гною і загатоўцы торфу з'яўляецца першая брыгада Нікалая Ільенкі. Брыгада вывезла 75 тон торфу і каля 200 тон гною.

Усе брыгады спаборнічаюць між сабой на лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Арганізавалі праверку зыканання соцыялістычных дагавораў. Перадавыя падцягваюць адстаючых, перадаюць ім вопыт свае работы.

У брыгадах створаны звенні, якія таксама заключылі дагаворы і разгортваюць соцыялістычнае спаборніцтва. Звяно другой брыгады Аксінні Расюк ужо сабрала 2 цэнтнеры курынага памёту, збірае таксама попел.

У калгасе ўжо тры брыгады (чацвертая, пятая і шостая) поўнасцю адрамантавалі сельскагаспаларчы інвентар. У бліжэйшыя дні скончаць рамонт астатнія тры брыгады. Якасць рамонту інвентару праверана камісіяй і прызнана добрай.

Насенне да сяўбы поўнасцю засыпана і ачышчана. Усё насенне сартавое. Першая праверка насення ў насенна-кантрольнай лабараторыі дала добрыя вынікі. Насенне мае добрую чыстату — не ніжэй 99 проц. і ўсхожасць — 100 проц. Яно захоўваецца ў новым і сухім свірні.

Зараз, у сувязі з Сесіяй Вярхоўнага Совета, яшчэ шырэй разгарнуліся соцыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух.

Аўдзей Уладзіміравіч ЧМЫРОЎ,
старшыня калгаса «Ленінскі шлях», Чыкалавіцкага сельсовета, Камарынскага раёна.

НЯМА КЛОПАТАЎ АБ НАСЕННІ

Становішча з падрыхтоўкай насення да сяўбы на калгасах Аршанскага раёна яўна пагражаючае. План засыпкі зерневых і бабовых выканан толькі на 77 проц. Па асобных сельсоветах і калгасах справа стаіць яшчэ горш.

Калгасы Шыбецкага сельсовета не выканалі плана засыпкі насення вікі і аўса. Не засыпана поўнасцю насенне і ў калгасах Дуброўскага сельсовета.

Ёсць рад сігналаў аб нездавальняючым становішчы ў раёне з ачысткай насення. Многія калгасы Якаўлевіцкага сельсовета не разгарнулі як след ачысткі насення. Калгас імя Сталіна не пратрываваў больш 200 пудоў насення аўса. У Крапівенскім сельсавеце план ачысткі насення аўса выканан на 45 проц., ячменю — 38 проц., пшаніцы — 41,3 проц., ільнасемя — 79 проц.

Згодна плану Наркамзема, калгасы раёна павінны абмяняць 445 тон сартавога насення. Абменена-ж толькі 26 тон.

У калгасе «16 партз'езд», Верабошчанскага сельсовета, парушаюць самыя элементарныя правілы захавання насення. Разам з насеўным матэрыялам ссыпаны кармовыя фонды. Стрэхі ў свірнах няспраўныя, у выніку гэтага часта на насенне сыплецца снег. У калгасе «Чырвоны меліяратар», Тумяніцкага сельсовета, амаль усё насенне заражана кляшчом.

Гэтыя трывожныя факты гавораць аб тым, што вынікі шкодніцтва, якое праводзілася ворагамі народа, арудаваўшымі ў райземаддзеле, не ліквідаваны. Цяперашняе кіраўніцтва райземаддзела (загалчык Баранаў, старшы агранам Райхман) не забяспечвае хутчэйшай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Паводле пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б), з 5 па 15 студзеня ва ўсіх калгасах патрэбна было правесці дасканалую праверку якасці засыпанага насення. Аднак райком КП(б)Б і РВК не арганізавалі праверкі, не паклапаціліся аб падрыхтоўцы насення да сяўбы.

ЗЯРНІЦКІ.



На віцебскім заводзе «Комінтэрн» лепшы стаханавец-фрэзероўшчык тав. Я. Буланчыкаў азнаменаваў адкрыццё Сесіі Вярхоўнага Совета СССР пераходам на абслугоўванне трох фрэзеровачных станкоў і норму выконвае на 500 проц. **На здымку:** стаханавец-фрэзероўшчык тав. Буланчыкаў ля станка, за работай.

Фото **Лупейка** (БСФ).

ПІСЬМЫ З СЕСІІ

ЗНАМЯНАЛЬНЫ ДЗЕНЬ

(Па тэлефону з Масквы)

Першае сумеснае пасяджэнне абодвух палат Вярхоўнага Совета СССР адбылося ў велізарным гістарычным зале вялікага Крэмлёўскага палаца. У гэтым зале адбываўся VIII Усесаюзны З'езд Советаў, прыняўшы Сталінскую Канстытуцыю. Зал — у строга вытрыманым, спакойным стылі. У сцяне, што ззаду стала прэзідыума, — ніша, у якой стаіць скульптура В. І. Леніна, ва ўвесь рост, нібы зорка ўглядаючагася ў тзары прысутных у зале дэпутатаў. Адзін бок зала займаюць дэпутаты Совета Нацыянальнасцей, а другі — дэпутаты Совета Саюза.

Дзве гадзіны папоўдні. Раздаецца гром апладысментаў. Месцы за сталом прэзідыума займаюць прэзідыумы Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей. У ложах з'яўляюцца кіраўнікі партыі і ўрада на чале з тазарышам Сталіным. Народ сустракае Сталіна і яго саратнікаў бурнымі авацыямі.

Вярхоўны Совет абмяркоўвае змены і далаткі ў некаторыя артыкулы Канстытуцыі СССР. Дэпутат Горкін і іншыя дэпутаты падкрэсліваюць велізарнае значэнне раздзялення раду буйных краёў і абласцей і ўтварэння новых абласцей, указваючы, што гэтым палягчаецца і набліжаецца кіраўніцтва да раёна.

Аднадушнае ўхваленне ўсяго зала сустракала прапанова дэпутата Горкіна аб дапаўненні артыкула 49 Канстытуцыі СССР — прадастаўленні Прэзідыуму Вярхоўнага Совета СССР права абвяшчаць у асобных мясцовасцях або па ўсяму СССР ваеннае становішча ў інтарэсах абароны СССР і забяспечання грамадскага парадку і дзяржаўнай безапаснасці.

Выступаўшыя ў спрэчках дэпутаты таварышы Касіор, Волкаў, Булганін і іншыя падтрымалі прапанову дакладчыка. Яны намалявалі яркую карціну бурнага росту гаспадаркі і культуры саюзных рэспублік. Тав. Касіор звярнуў увагу парэспублік. Тав. Касіор звярнуў увагу на асаблівую важнасць раздзялення і ўтварэння новых абласцей для справы ўмацавання пагранічных раёнаў Саюза. Тав. Волкаў расказаў аб росквіце прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры Беларусі і адзначыў вялікае значэнне стварэння абласцей у БССР.

Закрануўшы пытанне аб дапаўненні артыкула 49 Канстытуцыі СССР, выступаўшыя ў спрэчках дэпутаты асабліва падкрэслівалі, пры авацыях усяго зала, роль совецкай разведкі і яе кіраўніка Нікалая Іванавіча Ежова ва ўмацаванні нашай радзімы і ачышчэнні яе ад ворагаў.

З напружанай увагай была выслухана прамова старшыні Соўнаркома СССР тав. В. М. Молатава. Глава ўрада быў спаткан доўга незмаўкаючымі апладысментамі. Таварыш Молатаў прааналізаваў становішча нашага машынабудаўніцтва, рост нашай сельскай гаспадаркі, загатовак і абаснаваў неабходнасць існавання Наркамата машынабудаўніцтва, а таксама неабходнасць рэарганізацыі Камітэта загатовак у Наркамат загатовак. Глава ўрада асобна спыніўся на неабходнасці існавання Наркамата ваенна-морскага флота. Пад бурныя апладысменты ўсёй залы ён заявіў, што мы пастараемся хутчэй папаўняць наш флот магутнымі, баявымі караблямі. Мы створым флот з магутнай морскай артылерыяй, з морскай авіяцыяй, адпавядаючай дастоінству совецкага флота. Тав. Молатаў падкрэсліў шалёную гонку ўзбраенняў агрэсіўных дзяржаў. Гэта патрабуе, каб СССР меў моцны ваенны флот.

Г. Я. БЕЛКІН,
дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, прафесар Віцебскага заавэтэрынарнага інстытута.

ЗВОДКА БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ „ЗАГОТЛЁН"

аб ходзе загатовак ільнапенькапрадукцыі па раёнах БССР на 15 студзеня 1938 г. (у проц.)

РАЁНЫ	Ільнавалакно ў пераводзе на троцанае.	Пянька ў пераводзе на пянькусырэц.	РАЁНЫ	Ільнавалакно ў пераводзе на троцанае.	Пянька ў пераводзе на пянькусырэц.	РАЁНЫ	Ільнавалакно ў пераводзе на троцанае.	Пянька ў пераводзе на пянькусырэц.
Асвейскі	114,7	—	Мехаўскі	93,5	—	Добрушскі	105,7	25,6
Аршанскі	99,7	10,1	Магілеўскі	98,1	18,6	Ельскі	107,3	106,0
Бешанковіцкі	109,3	18,7	Мазырскі	88,5	138,0	Жыткавіцкі	104,7	140,0
Багушэўскі	98,3	36,7	Полацкі	117,6	—	Заслаўскі	109,8	3,6
Бялыніцкі	83,8	20,6	Пухавіцкі	87,7	31,2	Камарынскі	76,8	109,4
Бабруйскі	50,1	20,0	Расонскі	108,9	—	Клічаўскі	62,7	33,0
Барысаўскі	83,8	118,0	Рэчыцкі	72,1	78,4	Капыльскі	91,5	25,0
Б.-Кашалеўскі	66,4	10,8	Рагачоўскі	90,8	25,7	Капаткевіцкі	113,7	106,4
Быхаўскі	68,2	41,6	Сенненскі	107,1	26,4	Лагойскі	106,4	49,0
Бярэзінскі	71,4	56,8	Сіроцінскі	91,9	—	Лельчыцкі	69,5	123,5
Ветрынскі	101,5	—	Суражскі	114,2	—	Лоеўскі	107,6	62,2
Веткаўскі	77,0	26,4	Слуцкі	93,8	32,0	Любаньскі	82,1	30,4
Віцебскі	117,5	—	Смілавіцкі	95,7	20,0	Менскі	93,8	16,3
Гарадоцкі	106,6	—	Талачынскі	129,2	44,8	Нараўлянскі	67,0	112,4
Горацкі	116,0	12,6	Церахоўскі	108,1	20,7	Парыцкі	59,9	64,8
Дрысенскі	124,0	—	Ушацкі	104,2	13,8	Плешчаніцкі	94,0	76,7
Дубровенскі	69,8	0,4	Уваравіцкі	80,9	1,7	Прапойскі	80,3	45,3
Дрыбінскі	86,5	11,2	Хоцімскі	88,6	10,3	Петрыкоўскі	102,9	111,6
Даманавіцкі	70,3	108,9	Хойніцкі	64,2	77,0	Смалявіцкі	39,1	28,4
Жлобінскі	68,0	21,4	Халопеніцкі	109,4	53,1	Старадарожскі	77,0	61,0
Журавіцкі	104,0	15,2	Чашніцкі	116,5	14,0	Старобінскі	109,7	31,0
Круглянскі	111,7	25,0	Чавускі	104,1	38,4	Свяцілавіцкі	57,2	32,5
Касцюковіцкі	95,5	23,6	Шклоўскі	105,3	19,7	Тураўскі	110,0	150,0
Крупскі	103,0	55,9	**Па сістэме «Заготлён»**			Уздзенскі	126,7	54,0
Клімавіцкі	100,6	33,2				Чачэрскі	76,6	21,0
Крычаўскі	92,4	48,6		99,8	36,9	Чырвонаслаб.	118,1	65,5
Кармянскі	65,6	21,6	Асіпавіцкі	76,3	74,0	Чэрвеньскі	54,3	58,7
Кіраўскі	80,2	17,3	Брагінскі	77,9	94,0	Чэрыкаўскі	85,8	25,1
Чырвонапольскі	79,0	21,0	Бягомльскі	103,8	110,6	Усяго па БКС	85,4	66,8
Лёзнянскі	98,8	—	Гомельскі	104,8	57,0	Разам па БССР	98,2	47,6
Лепельскі	107,7	7,3	Глускі	86,7	79,3			
Мсціслаўскі	90,1	5,3	Грэскі	113,6	47,0			

А. І. ЦЕМКІН

Намеснік Старшыні СНК БССР.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ТОРФСЕЗОНУ 1938 ГОДА

У БССР торф складае каля 80 проц. энергетычных рэсурсаў рэспублікі і мае выключнае значэнне для развіцця прамысловасці, электрыфікацыі і ўсёй народнай гаспадаркі.

Ворагі народа адным з галоўных аб'ектаў сваёй падрыўной работы выбралі тарфяную прамысловасць і нанеслі ёй значную шкоду.

Развіццё тарфяной прамысловасці тармазілася як на існуючых торфзаводах, так і ў частым ўводу ў эксплаатацыю новых торфараспрацовак; стваралася дыспрапорцыя паміж аб'ёмам капітальнага будаўніцтва і магутнасцямі торфагаспадарак, зрывалася будаўніцтва на торфараспрацоўках, у тым ліку жыллёвае, у рэзультаце чаго ствараліся пякучасць, ненармальныя ўмовы для рабочых тарфянікаў, што прывозіла да зрыву выканання плана торфаздабычы.

Важнейшае рашэнне XVII партз'езда аб здабычы звыш 70 проц. торфу механізаванымі спосабамі на канец 2-й пяцігодкі па БССР сарвана. У 1937 годзе з усяго здабытага па рэспубліцы торфу, механізаванымі спосабамі было здабыта толькі 18,6 проц.; працэсы сушкі, уборкі і транспартыроўкі торфу на торфапрадпрыемствах амаль зусім не механізаваны. З мэтаю ігнаравання торфу, як апалу і зрыву работы прамысловасці і электрастанцый, пытанням якасці тарфяной прадукцыі не аддавалася ніякай увагі, праводзілася фальсіфікацыя якасных характарыстык торфу. У рэзультаце гэтага, у самыя напружаныя перыяды работы электрастанцый (перыяды максімума) дастаўляўся нядобраякасны торф, што цягнула за сабой перабоі ў рабоце станцый і прадпрыемстваў.

Для таго, каб стварыць разрыў паміж растучай патрэбнасцю ў апале і магчымасцямі яе пакрыцця, а таксама з мэтаю абмежавання далейшага развіцця тарфяной прамысловасці, зялася школніцкая работа ў справе асваення новых торфамасіваў.

У сезон 1937 года тарфяная прамысловасць уступіла зусім непадрыхтаванай як у галіне падрыхтоўкі торфбалот, так і ў будаўніцтве і рамонце абсталявання. Многія торфзаводы нясвоечасова пачалі сезон, не гледзячы на наяўнасць спрыяючых кліматычных умоў. Важнейшай умовай у справе забяспячэння зыкання праграмы здабычы торфу з'яўляецца поўнае выкарыстоўванне абсталявання і адпаведная яго падрыхтоўка. Кожная гадзіна спынення машын у тарфяной прамысловасці роўна 3—4 гадзіны спынення машын прадпрыемств з кругласутачнай работай. Між тым рамонт абсталявання на асобных прадпрыемствах быў праведзен яўна злачынна. У сувязі з гэтым з першых-жа дзён пачаліся непаладкі і прастоі машын. Вялікая колькасць прастояў абсталявання і аварый машын мела месца ў радзе прадпрыемстваў на працягу ўсяго сезону. Пацвярджаннем яўна злачынных адносін да абсталявання з'яўляецца тое, што ў радзе выпадкаў аварыі адбываліся ў рэзультаце пападання ў рабочыя часткі машын металічных дэталяў (торфазавод «Хвойны Масток»—Магілеў і інш.). З-за незабяспечанасці запаснымі часткамі, машыны прастойвалі цэлыя змены. На перасоўку і кантоўку машын затрачвалася вялікая колькасць рабочага часу. Асабліва дрэнна працавала ў 1937 годзе буйнейшая торфагаспаларка рэспублікі — Асінторф, дзе прастоі кранаў вялікага гідраторфу за сезон складалі каля 50 проц. усяго часу іх работы.

Канчатковыя вынікі работы торфапрамысловасці вызначаюцца не колькасцю здабытай сыравіны, а колькасцю тазарнай прадукцыі, якую можна будзе накіраваць у печы электрастанцый, фабрык і заводаў. Між тым, многія работнікі тарфяной прамысловасці ў пагоні за агульнымі процантамі выканання праграмы не звачарылі ўвагі на арганізацыю своечасовай, планамернай сушкі і ўборкі торфу. Па аднаму толькі торфзаводу Асінторф з усяго здабытага ў сезоне 1937 года (пазодле зводак) колькасці торфу — 291 тысяча тон — таварнага аказалася толькі 240 тыс. тон. Такім чынам, нястача і недасушка складалі 51 тыс. тон. Такое-ж становішча было і па іншых торфагаспадарках.

Шкодніцкая работа ворагаў народа, безгаспадарчасць, неарганізаванасць прывялі да таго, што тарфяная прамысловасць закончыла 1937 год з вялікім прарывам. Яна недадала краіне каля 300 тыс. тон торфу.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР за апошні час аддавілі тарфяной прамысловасці шмат увагі і праводзяць рад практычных мерапрыемстваў па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў гэтай галіне сацыялістычнай гаспадаркі. Саюзны ўрад ўсямерна салдзейнічае справе развіцця тарфяной прамысловасці ў БССР. Соўнаркомам Саюза вынесена спецыяльная пастанова аб выдзяленні для тарфяной прамысловасці БССР неабходных грашовых сродкаў і матэрыяльных рэсурсаў. Гэта дае поўную магчымасць ужо ў 1938 годзе падняць работу тарфяной прамысловасці, паставіць яе на належную вышыню. Адказнай задачай, пастаўленай партыяй і ўрадам перад усімі работнікамі тарфяной прамысловасці на 1938 год, з'яўляецца задача забяспячэння здабычы не менш 3.100 тысяч тон высокакаяснага торфу. Для выканання гэтай задачы неабходна напружаная, арганізаваная і даклалная работа, перш за ўсё, па падрыхтоўцы да сезону. Між тым патрэбнай работы ў гэтым напрамку пакуль няма. На мясцах яшчэ не прыступілі да арганізаванага набору рабочай сілы. Рамонт абсталявання і інвентару запягваецца, не гледзячы на прамое ўказанне ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб сканчэнні рамонту, праверкі, прыёмкі і апрабавання абсталявання да 1 сакавіка 1938 г. Вывазка торфу з балот і вызваленне ўчасткаў пад здабычу таксама ідзе выключна дрэнна. Зацверджаны СНК план вывазкі торфу на IV квартал 1937 г. невыканан. Дырэктары торфазаводаў і прадпрыемстваў-спажыўцоў не кіруюць аператы́ўна гэтай справай.

Райвыканкомы не аказваюць у гэтай справе належнай садзейнасці прадпрыемствам. Па Сіроцінскаму раёну план гужавой вывазкі торфу з торфзавода імя Даўмана выканан у IV квартале 1937 года ўсяго на 20 проц. (вытрэзена 1,5 тыс. тон, замест 7,5 тыс. тон); па Асіпавіцкаму раёну, пры плане 15 тысяч тон, вывезена ўсяго 2,4 тысяч тон. Не лепш стаіць справа па Смілавіцкаму, Рагачоўскаму і іншых раёнах. Гомельскі тлушчакамбінат і рэчыцкая запалкавая фабрыка «Х Кастрычнік» не прыступілі яшчэ да вывазкі торфу з торфарцеляў «Глыбоцкае», Церахоўскага раёна, «2-я пяцігодка», Журавіцкага раёна. Не гледзячы на тое, што ёсць механізаваны транспарт, БелДРЭС злачынна зрывае вывазку торфу з торфазавода Асінторф. Такія-ж адносіны да гэтай важнейшай справы і па іншых спажыўцах.

Што патрэбна для таго, каб забяспечыць падрыхтоўку да торфасезону 1938 года?

Патрэбна з большэвіцкай настойлівасцю і арганізаванасцю ўзяцца за рамонт абсталявання. Патрэбна, каб усе работы па рамонту вяліся па цвёрдаму календарнаму плану, пад асабістым назіраннем і кантролем кіраўнікоў прадпрыемстваў, з тым, каб закончыць яе, уключаючы прыёмку і апрабаванне, да ўстаноўленага тэрміну — 1 сакавіка 1938 г. Патрэбна таксама планава забяспечыць і сканчэнне да зацверджанага тэрміну — 15 красавіка 1938 года — усяго жыллёвага і соцбытавога будаўніцтва. Патрэбна неадкладна пакончыць з расхлябанасцю ў справе вывазкі торфу. Торфапрадпрыемствы і прадпрыемствы-спажыўцы торфу павінны максімальна фарсіраваць вывазку ўласным транспартам. Раённыя арганізацыі павінны аказаць па мясцах ўсямерную садзейнасць у справе арганізацыі зывазкі торфу гужавым транспартам калгасаў, з тым, каб скарыстаць спрыяючы для гэтага зімовы перыяд.

Да пачатку торфсезона не павінна быць ні аднаго торфазавода, участка і агрэгата, які-бы пачаў работу са спазненнем. Не павінна быць ні адной торфагаспадаркі, якая не забяспечыла-б неабходнымі жыллёва-бытавымі і культурнымі ўмовамі рабочых тарфянікаў, якія прыбудуць на торфараспрацоўкі.

Работа на мясцах павінна быць арганізавана так, каб кожны агрэгат мог працаваць безаварыйна і з мінімальнай колькасцю эксплаатацыйных прастояў. Для гэтага з першых-жа дзён сезона неабходна арганізаваць і ўзначаліць стаханаўскі рух на кожным торфапрадпрыемстве, участку, і агрэгаце, забяспечыць усе агрэгаты неабходнымі запаснымі часткамі, забяспечыць своечасовую падрыхтоўку кар'ераў і агляд іх перад пачаткам эксплаатацыі, а таксама прымацаваць па ўвесь сезон адказных кіруючых работнікаў завода да кожнага агрэгата.

Сур'ёзнейшая ўвага павінна быць накіравана не толькі на колькасную здабычу торфа, але і на пытанні планавай сушкі і ўборкі торфу, выканання якіх вырашае вынік работы прадпрыемстваў. Неабходна ажыццяўляць сістэматычны кантроль за становішчам палёў і сушкі торфу. У 1938 годзе не павінна быць ні аднаго прадпрыемства, якое не выканала-б плана як па валавой здабычы, так і па колькасці таварнага торфу.

Тарфяныя прадпрыемствы павінны неадкладна арганізаваць і разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да сезону 1938 года і забяспячэнне выканання ўстаноўленага плана. На кожным прадпрыемстве ў бліжэйшыя дні павінны быць скліканы злёты стахановаў з інжынерна-тэхнічнымі работнікамі прадпрыемстваў па распрацоўцы практычных мерапрыемстваў па лепшай падрыхтоўцы і правядзенню сезона 1938 года.

Надыходзячы ўсебеларускі злёт стахановаў тарфяной прамысловасці павінен будзе падвесці вынікі падрыхтоўкі да торфсезона 1938 года.

Большэвіцкая падрыхтоўка торфапрадпрыемстваў да сезону, далейшы ўзлёт і разгортванне стаханаўскага руху, арганізацыя і забяспячэнне яго адміністратыўна-тэхнічным персаналам, сур'ёзная работа ўсіх грамадскіх арганізацый прадпрыемстваў, — усё гэта забяспечыць поўнае выкананне і перавыкананне плана здабычы 3.100 тыс. тон высокакаяснага торфу.

НАРОДНАМУ АРТЫСТУ СССР К. С. СТАНІСЛАЎСКАМУ—75 ГОД

ЗМАГАЦЦА ЗА НОВЫЯ ПОСПЕХІ НАШЫХ ТЭАТРАЎ

НАСТАЎНІК СЦЭНІЧНАГА МАЙСТЭРСТВА

Складанае, цудоўнае і любімае ўсімі тэатральнае мастацтва нашай вялікай сацыялістычнай радзімы налічвае вялікую колькасць яркіх, таленавітых артыстаў сусветнага значэння, якія захапляюць нас сваім выдатным майстэрствам, беззаветна аддаюць усё сваё жыццё, сваю творчасць справе росквіту сацыялістычнай культуры.

Сярод гэтых лепшых з лепшых, таленавітых з таленавіцейшых, выключнае месца займае геніяльны мастак-рэаліст і настаўнік сцэнічнай праўды **Канстанцін Сергеевіч Станіслаўскі.**

Ён пражыў 75 год. З іх больш паўстагоддзя няспынна, неўгамонна змагаўся і змагаецца за вялікае мастацтва.

Ён першы падняў драматычнае мастацтва вялікага рускага народа на велізарную ідэйна-прынцыповую і мастацкую вышыню,—і цудоўны тэатр нашай радзімы ордэна Леніна МХАТ, створаны і вось ужо 40 год кіруемы ім, стаў лепшым тэатрам ва ўсім свеце, стаў лепшай школай для ўсіх працаўнікоў сцэнічнага мастацтва, шукаючы праўды жыцця на сцэне; стаў гордасцю ўсіх народаў нашай вялікай сацыялістычнай радзімы.

Станіслаўскі стварыў выдатную сістэму работы над роллю і спектаклем і сістэму выхавання акцёраў, на аснове якой вырасла вялікая плеяда выдатных савецкіх артыстаў. Ён заўсёды безупынна, штодня працаваў і працуе над стварэннем новых і новых кадраў таленавітых, сумленных, мыслячых артыстаў для тэатраў нашай краіны.

Мастацтва МХАТ'а, яго цудоўныя спектаклі і артысты не маюць у сваёй творчасці імкнення здзівіць гледача знадворнымі эфектамі і фармалістычнымі прыёмамі.

Станіслаўскі заўзяты вораг усякай коснасці, штампаў у мастацтве і гатовых «рацэптаў» ігры. Ён вучыў і вучыць работнікаў тэатра ісці нага ў нагу з жыццём, вучыцца ў жыцця, спазнаваць яго ва ўсёй велічы і многагранасці і ў самым жыцці знаходзіць сапраўдную крыніцу для натхнення і творчасці.

Усе мы, азначаючы 75-гадовы юбілей Станіслаўскага, да канца павінны ўсвядоміць неабходнасць рашучай барацьбы з пагубнымі вынікамі дзейнасці тых «пастаноўшчыкаў-эксперыментатараў», якія доўгія годы насаджалі ў Совецкай Беларусі тэорыю ўстараласці кансерватызма Станіслаўскага і МХАТ'а і беспрынцыпна прапаведвалі ў сваіх работах і сваіх выказваннях «рэволюцыйнасць» і «геніяльнасць» Мейерхольда — гэтага пігмея ў мастацтве ў параўнанні з вялікім Станіслаўскім.

Мы павінны таксама з усёй глыбінёй усвядоміць, што ў нашых тэатрах вельмі часта панае рамесніцтва, замест сапраўднай творчасці, часта жывыя пошукі падменьваюцца агідным штампам, часта, замест глыбокага пранікнення ў сутнасць вобраза, мы павярхоўна, схематычна падаем яго на сцэне па гатоваму рэцэпту.

Лепшым падарункам ад усіх нас геніяльнаму Станіслаўскаму, гэтаму настаўніку сцэнічнай праўды, будзе сапраўдны глыбокае вывучэнне яго цудоўнай творчай дзейнасці, у мэтах стварэння на сцэнах нашых тэатраў добрых спектакляў, спектакляў вялікай жыццёвай праўды, вартых нашай вялікай эпохі.

Л. РАХЛЕНКА,
загадчык мастацкай часцю Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.

СІНОНІМ ЛЕПШЫХ ТЭАТРАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

К. С. Станіслаўскі —гэта ўжо не проста імя, а сінонім лепшых тэатральных традыцый. Станіслаўскі — заўсёдныя пошукі і знаходкі, каб падняцца на новыя творчыя вяршыні.

Увесь шлях К. С. Станіслаўскага напоўнен самааналізам, самаўдасканаленнем, самымі строгімі крытычнымі адносінамі перш за ўсё да сябе, а пасля і да сваіх сатаварышаў. Станіслаўскі многагранны як і ўсякі вялікі індывідуум, ён не толькі мастак, але і знаток творчай псіхалогіі, які заўсёды абапіраецца на жывую сапраўднасць, на жывога чалавека.

У сілу гэтых сваіх якасцей, сваёй пільнай і праўдзівай прыроды ён цалкам і поўнасцю быў ахоплен інтарэсамі нашай прыгожай рэчаіснасці, ён увесь з намі, ён, па праву, імянуецца совецкім майстрам-мастаком і кіраўніком лепшай тэатральнай рэалістычнай мысліі.

Мне ўспамінаюцца многія расказы маіх настаўнікаў, — народнага артыста Н. Н. Сінельнікава, які вельмі часта сустракаўся з К. С. Станіслаўскім, і народнага артыста Саюза ССР М. М. Тарханава, які цяпер працуе ў МХАТ'е.

Нашым маладым совецкім акцёрам можа здацца зараз абсурдам не прапрацаваць доўга п'есу за сталом, у абмене думкамі, у глыбокім доўгім аналізе як асобных вобразаў, так і ўсяго матэрыялу ў цэлым. А як доўга і горача дабіваўся гэтага права на аналіз у рэжысёра ўзаемна з акцёрам К. С. Станіслаўскі! А пошукі і вызначэнні так званага «скразнога дзеяння», знаходжанне адпраўных і апорных пунктаў усёй яго тэорыі — «сістэмы», якая ніколі не была ў яго адарвана ад жывога чалавека, ад акцёра, не была сухой тэорыяй у імя выдумкі, як у Мейерхольда, а заўсёды была тэорыяй практычнай, для жывога рэалістычнага дзеяння. Станіслаўскі вучыць: «дзевяць дзесятых чалавечай прыроды несвядомыя, адна дзесятая свядомая. Гэта адна дзесятая зучыцца, як стварыць (на сцэне) дзевяць дзесятых».

Такім чынам, Станіслаўскі шукае свядомых прыёмаў творчасці. Глыбокія аналітычныя прыёмы ў тэорыі, бліскуча пацверджаныя і ў практыцы (лэе заўсёды багацце ўнутранага свету ставілася на першае месца, — а форма павінна выцякаць са зместу) падмацоўваліся яшчэ і асабістым абаяннем К. С. Станіслаўскага. Яго супрацоўнікі, аб якіх я сказаў, успаміналі, як К. С. Станіслаўскі прыходзіў на рэпетыцыі часам незнаёмай яму п'есы. Праз некалькі мінут ён вызначаў не толькі недахопы выканання усе «штампы», ворагам якіх ён заўсёды быў і ёсць, або якую-небудзь псіхафізіялагічную прычыну творчай няўдачы, але распытаўшы аб п'есе, алгадваў самую сутнасць мастацкага задання — тое, што ў даных сцэнічных адносінах і ўзаемадзеянні магло быць найбольш цікава, — і даваў незаменныя парады.

І галоўнае ў плённай творчасці Станіслаўскага — гэта тое, што цэлая плеяда яго вучняў пераймаўжае і пашырае яго палажэнні. Вырасла і расце магутная рацэ сапраўдных совецкіх акцёраў - майстроў, якія ўпэўнена ідуць наперад, да авалодання зышынямі сацыялістычнага рэалізма, пры пастаянным палтрыманні нашага мудрага правадыра, друга мастацтва таварыша Сталіна.

В. ДАРВІШАЎ,
мастацкі кіраўнік Віцебскага дзяржаўнага тэатра.



Да 75-годдзя з дня нараджэння выдатнага майстра совецкага тэатра і выдатнага акцёра, аднаго з аснавальнікаў і мастацкага кіраўніка Маскоўскага ордэна Леніна Мастацкага Акадэмічнага Тэатра СССР імя Горкага, ордэнаносца, народнага артыста СССР **Канстанціна Сергеевіча Станіслаўскага. На здымку:** народны артыст Саюза ССР **К. С. Станіслаўскі.**

СЛАЎНАЯ ДАТА

Слаўная дата творчага жыцця майстра і настаўніка сцэны народнага артыста СССР Канстанціна Сергеевіча Станіслаўскага — гэта свята школы Мастацкага тэатра, які выхаваў магутную плеяду талентаў, лепшых артыстаў нашай краіны, заваяваў сусветнае прызнанне.

Гонар і слава майстру, настаўніку і арганізатару, які выхаваў і выхоўвае пакаленне артыстаў, каб яны неслі ў масы творчыя навыкі, аснаваныя на рэальным паказе жыцця.

Нам дарагі гэты просты і вялікі чалавек, грамадзянін нашай радзімы тым, што ён сваімі думкамі запальвае сэрцы артыстаў, аллюстроўвае праўду жыцця і стварае жывыя мастацкія вобразы.

Несучы і захоўваючы ў сваім сэрцы словы таварыша Сталіна аб тым, што артысты — «інжынеры чалавечых душ», сапраўдныя мастакі, ведаюць, што народ нашай радзімы не церпіць хлусні і фальшы, скажэння сапраўднасці, радуецца творам, у якіх высокая мастацкая якасць і ідэйная глыбіня, адлюстраваная праўдзіва, шчыра і проста, — нам трэба сур'ёзна вывучаць вопыт майстэрства гэтага вялікага мастака-рэаліста, настаўніка сцэны, які ва ўсіх сваіх думках заклікае артыста да праўды, шчырасці і хараства.

Л. ХАЙЛАЎ,
рэжысёр Тэатра оперы і балета.

СТАНІСЛАЎСКІ ЎПЛЫВАЕ НА МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА

Дзейнасць К. С. Станіслаўскага, які паслядоўна праводзіў усе творчыя прынцыпы рэалістычнага тэатра, паказала сябе ва ўсіх галінах мастацтва. У музыцы традыцыі МХАТ'а знайшлі сваё непасрэднае адлюстраванне ў жанры оперы. Музыкальная студыя пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Неміровіча-Данчэнка, оперная студыя імя Станіслаўскага — вось дзве музыкальныя тэатральныя арганізацыі, праз якія творчыя метады Станіслаўскага непасрэдна ўліваюцца ў тэатральнае жыццё Совецкага Саюза. «Не іграючы спявак, а спяваючы актор» — вось дэвіз Станіслаўскага. Але асноўнае ў Станіслаўскага, што адлюстравалася ва ўсіх галінах совецкага мастацтва, у прыватнасці ў музыцы, — гэта метад рэалізма, праўды ў мастацтве. Дзякуючы гэтым якасцям, яму ўдалося «адкрыць» цалы рад п'ес, якія не мелі да пастаноўкі іх у МХАТ'е патрабага поспеху. Чэхаў і Горкі ўпершыню пачалі сапраўднаму загучэлі на сцэне Мастацкага тэатра.

Асабліва каштоўна вучэнне Станіслаўскага і для музычнага мастацтва. Іменна старанна вывучыць, усебакова праверыць увесь матэрыял, адчуць яго, пачуць праўду ў мастацтве — такія асноўныя патрабаванні да сапраўднага творчага работніка і на музычным фронце. Гэтыя патрабаванні — патрабаванні новага мастацтва краіны Совецкіх, мастацтва сацыялістычнага рэалізма.

А. ДЗМБО,
дырыжор-асістэнт Беларускага дзяржаўнага філармоніі.

ВЯЛІКІ МАЙСТАР

Мне не давялося прадаваць з Канстанцінам Сергеевічам Станіслаўскім. Але ў сваёй рабоце я інстынктыўна адчуваю ўздзеянне на сабе яго творчасці. Мне, як маладому работніку тэатра, вельмі блізка тое, да чаго вядзе гэты вялікі майстар, чаму вучыць ён. Прачытаўшы кнігу Станіслаўскага «Маё жыццё ў мастацтве» я зразумеў, што совецкаму гледачу патрэбен сапраўды рэалістычны тэатр, які паказвае нашае цудоўнае жыццё.

І вось зараз, працуючы ў калгасным тэатры, я дабіваюся таго, каб нашы калгаснікі бачылі ў маёй творчасці тое, чаму вучыць Канстанцін Сергеевіч. Стараючы вобраз, я буду дамагацца сапраўднага сацыялістычнага рэалізма.

Жадаю К. С. Станіслаўскому многіх гадоў жыцця і плённай працы.

Н. САЛАЎЕЎ,
акцёр Мазырскага рабоча-калгаснага тэатра.

АЗДАРАВІЦЬ КІРАЎНІЦТВА МЕНСКАГА ЧЫГУНАЧНАГА ВУЗЛА

Доўгі час на Менскім чыгуначным вузле арудавала, выкрытая зараз органамі НКВД, кучка ворагаў народа. Прабраўшыся на кіруючыя пасады, фашысцкія наймі-ты праводзілі сваю падрыўную шкодніцкую работу па арганізацыі крушэнняў паяздоў, выводзілі са строю паравозы, вагоны, павялічвалі прастой вагонаў пад грузавымі аперацыямі і зрывалі графік руху паяздоў.

Па прамому заданню сваіх фашысцкіх гаспадароў ворагі народа ў кастрычніку 1937 г. арганізавалі на ст. Смалявічы крушэнне трох паяздоў, два з якіх былі перапоўнены людзьмі. Толькі дзякуючы пільнасці кандуктарскіх і паравозных брыгад справа абышлася без чалавечых афяр. А праз месяц контррэволюцыйная банда зноў арганізавала ў ноч з 11 на 12 лістапада крушэнне поезда № 1220 на ст. Менск-747 клм., прыняўшы яго на заняты шлях.

Былы начальнік гэтай станцыі вораг народа для таго, каб замаскіраваць сваю падрыўную варожую дзейнасць, свядома ствараў пякучасць рабочай сілы, развальваў прапоўную дысцыпліну, разбураў стрэлачную гаспадарку на станцыі.

У галіне пагрузкі і выгрузкі ворагі народа і іх прыспешнікі прымалі ўсе меры к таму, каб зрываць дзяржаўны план пагрузкі і выгрузкі. Яны павялічвалі прастоі вагонаў пад грузавымі аперацыямі, падаючы вагоны на пункты выгрузкі позна і пачкамі, свядома скапляючы па некалькі вагонаў ад усіх прыбываючых паяздоў.

У паравозным гаспадарцы ворагі народа цалымі пачкамі вывозілі паравозы са строю. Павялічваючы прастой паравозаў у рамонце, яны выпускалі іх пад паязды з вялікімі недадзелкамі, імкнучыся ствараць аварыі і выбіваць паязды з графіку.

Для таго, каб выклікаць незадаволенне рабочых дэпо, ворагі трымалі на паравозах брыгады па 18 і больш гадзін, а змену ім выклікалі ў дэпо, дзе рабочыя выкліканай змены цалымі днямі праседжвалі без работы.

Пад пагрозай звальнення з работы яны прымушалі машыністаў весці паязды з хворымі паравозамі (паравоз ЭУ-7703).

Здавалася-б, што пасля таго, як органамі НКВД была выкрыта гэта банда ворагаў, партыйныя арганізацыі, камандзіры вузла і аддзялення возьмуцца па-большэвіцку за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва.

Аднак, вынікі работы ўсіх служб Менскага вузла гавораць аб тым, што сапраўднай барацьбы па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на Менскім вузле яшчэ няма.

Вось факты. У апошнюю дэкаду снежня прастой транзітных вагонаў па аддзяленню складаў 6,9 гадзін пры заданні 4,2, а мясцовыя вагоны прастойвалі замест 8,2 па 13,6 гадзін. На станцыі-ж Менск-таварная гэты прастой транзітных вагонаў дасягнуў 7,4 гадз. пры норме 4,3; мясцовыя вагоны пры норме 9,7 гадзін стаялі па 21,7.

За гэту дэкаду ўсяго 58,3 проц. паязду было адпраўлена і следавала па графіку.

Не лепш працуюць Менскі вузел і аддзяленне чыгункі і зараз.

Напрыклад, за 7 дзён студзеня прастой транзітных вагонаў складаў 8,8 гадзіна пры норме 4,2, а мясцовых вагонаў — 13 гадзін пры норме 8.

На ст. Менск-таварная за 7 дзён студзеня прастой вагонаў выразіўся: транзітных 10,2 гадзіны пры норме 4,3, мясцовых—17,6 гадзіны, пры норме 10,7 гадзіны.

Асабліва дрэнна працуе паравозное дэпо. Абялічка паравозаў, якую насаджалі ворагі народа, існуе і па сёння. Яна прывяла да таго, што ў снежні 1937 года было 177 выпадкаў зрыву спаранай язды. Абялічка ў рамонце паравозаў прывяла да таго, што паравоз Щ-512 амаль кожны дзень рамантаваўся. Напрыклад, 20 снежня гэты паравоз быў пастаўлен на прамывачны рамонт і, не гледзячы на тое, што паравоз прастаяў у рамонце 14 гадзін звыш нормы, 23 снежня яго зноў паставілі ў міжпаязны рамонт. 25 снежня гэты паравоз у трэці раз становіцца ў рамонт.

Нягодбраякасны рамонт, бескантрольнасць з боку начальніка дэпо Сіненка прывялі да таго, што паравоз ЭУ-679-65 за 14 дзён работы пасля прамывачнага рамонту сем разоў заходзіў у дэпо на міжпаязны рамонт.

Гэты паравоз быў пастаўлен на прамывачны рамонт 23 снежня з запісам рамонту аглядзіць поршні, залатнікі, насос тормаз Вестынгауза. 26 снежня паравоз вышаў з рамонту, а 27-га зноў стаў на рамонт. Машыніст запісаў у кнігу рамонту наступнае: «Аглядзець левы залатнік, не выключаецца, аглядзець пярэдні паршнявы сальнік з левага боку, аглядзець прэс-маслёнку Фрымана, умацаваць абаротны контр-крывашып, балтаецца». І так 26 снежня паравоз вышаў з рамонту, а такой «дробязі», як хістанне абаротнага контр-крывашыпа, не заўважылі. 28 снежня паравоз зноў становіцца ў рамонт з-за дрэннай работы прэс-маслёнкі.

30 снежня — зноў у рамонт. Машыніст запісвае:—праверыць ход залатнікоў, аглядзець прэс-маслёнку, абратныя клінаны, пярэдні і задні паршнявыя сальнікі з правага боку, паставіць паперажальныя стрункі да тормаза паравоза. І гэта — пасля 4 дзён работы паравоза, выпушчанага з прамывачнага рамонту. 2, 4 і 7 студзеня гэты паравоз таксама станавіўся ў рамонт па адных і тых-жа недаробках.

Такіх фактаў можна было-б прывесці шмат, але і гэтага дастаткова для таго, каб паказаць, што ў паравозным дэпо, як і на Менскім чыгуначным вузле яшчэ і дасюль арудуюць ворагі народа.

Дзе-ж прычына такой дрэннай работы Менскага вузла? Прычына перш за ўсё крыецца ў тым, што начальнік аддзялення Фралоў, які працаваў ў цесным кантакце з выкрытымі ворагамі народа, і зараз працягвае сваю падрыўную дзейнасць. Па яго загаду пасля выкрыцця ворагаў народа на ст. Смалявічы, быў накіраван туды на «ўмацаванне» работы станцыі Лагацкі, сын жандара. Фралоў усе меры прымаў да таго, каб выгараджаць і апраўдаць на судзе ворага народа былога начальніка ст. Менск-747 клм.

Начальнік Менскага аддзялення паравозный гаспадаркі Досін і начальнік паравознага дэпо Сіненка шмат балбочуць аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, заяваючы ўсіх, што ліквідацыя вынікаў шкодніцтва ідзе паспяхова. Аднак, усё гэта астаецца пустой балбатнёй.

Ды і зразумела. Досін доўгі час працаваў сумесна з выкрытымі ворагамі народа. Ён некаторых з іх трымаў у дэпо, як незамянімых спецыялістаў. Зразумела таму, што і зараз Досін стаіць у баку ад выкрыцця варожых дзеянняў у паравозным дэпо.

Партыйны камітэт дэпо (сакратар Камлеў) і партыйны камітэт вузла (сакратар Хасін) нічога не зрабілі з свайго боку, каб хутчэй аздаравіць работу як дэпо, так і ўсяго Менскага вузла.

Неабходна адзначыць, што як палітадзел аддзялення, так і Кагановіцкі РК партыі таксама нічога не робяць.

Кіраўніцтва Менскага чыгуначнага вузла патрэбна тэрмінова аздаравіць.

Н. СТРЭЛЬЧАНКА, В. БАГАЧОНАК.

ДАПАМОГА РАБОЧЫХ ГОРАДА МТМ і МТС

ВІЦЕБСК. **(Кар. «Звязды»).** Рэалізуючы ўказанне ЦК ВКП(б) і СНК СССР адзінаццаць прадпрыемстваў горада — завод імя Кірава, маслазавод, шклазавод, акулярная фабрыка і інш. — выслалі ў Горацкую МТМ рамонтную брыгаду для аказання дапамогі ў рамонце трактараў.

У складзе брыгады лепшыя стаханаўцы горада: Аляксееў — член горсовета, Судакоў з фабрыкі імя КІМ, Кабісаў з іголкавага завода і інш. Брыгаду ўзначальвае знатны стаханавец — каваль завода імя Кірава т. Лін Міхаіл Рувімавіч. Брыгада прыбыла на месца і прыступіла да работы.

Гэтымі днямі гарком партыі таксама высылае рамонтныя брыгады ў дзве машынна-трактарныя станцыі Бешанковіцкага раёна. Апрача таго, рад прадпрыемстваў горада — фабрыкі «Спяг індустрыялізацыі», гнутай мэблі і інш. — выслалі ў свае падшэфныя калгасы брыгады з лепшых стаханаўцаў для дапамогі ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

К. С. СТАНІСЛАЎСКІ

(Да 75-годдзя з дня нараджэння)

Сёння совецкая грамадскасць адзначае 75-годдзе з дня нараджэння буйнейшага тэатральнага майстра, аднаго з аснавальнікаў і кіраўнікоў Маскоўскага ордэна Леніна Мастацкага Акадэмічнага тэатра імя Горкага, двойчы ордэнаносца — Канстанціна Сергеевіча Станіслаўскага.

Сваю кнігу «Маё жыццё ў мастацтве» Станіслаўскі пачынае наступнымі радкамі:

«Я нарадзіўся ў Маскве ў 1863 годзе — на рубяжы двух эпох. Я яшчэ памятаю астаткі прыгоннага права, сальныя свечкі, карселевыя лямпы, тарантасы, дар мезы, эстафеты, крэмневыя ружжы, маленькія гарматы накшталт цацачных.

На маіх вачах узнікалі ў Расіі чыгункі з кур'ерскімі паяздамі, параходы, ствараліся электрычныя пражэктары, аўтамабілі, аэрапланы, дрэдноўты, падводныя лодкі, тэлефоны — дротавыя, бяздротавыя радыётэлеграфы, 12-дзюймовыя гарматы.

Такім чынам, ад сальнай свечкі — да электрычнага пражэктара, ад тарантаса да аэраплана, ад парусной — да падводнай лодкі, ад эстафеты — да радыётэлеграфа, ад крэмневага ружжа — да гарматы Берта і ад прыгоннага права — да большэвізма і комунізма».

Сямідзесяціпяцігадовы юбілей Станіслаўскага амаль супадае з юбілеем самога МХАТ'а, які рыхтуецца не ў далёкім будучым адсвяткаваць 40-годдзе свайго існавання. Дзейнасць Станіслаўскага неадлучна ад Мастацкага тэатра, які ўзнік, як вядома, у 1898 годзе ў выніку адзначальнай сустрэчы К. С. Станіслаўскага і Вл. І. Неміровіча-Данчэнка.

Звыш паловы свайго жыцця аддаў К. С. Станіслаўскі МХАТ'у. Але яго тэатральная работа ахапляе значна большы перыяд. З яго шырока вядомай кнігі «Маё жыццё ў мастацтве» мы ведаем, што тэатрам ён пачаў захапляцца яшчэ ў юныя годы: першыя яго выступленні адбыліся ў 1877 годзе ў хатніх пастаноўках «Стары матэматык» і «Чашка чаю». Ужо ў Маскоўскім таварыстве мастацтва і літаратуры К. С. Станіслаўскі зарэкамендаваў сябе як таленавіты рэжысёр і акцёр. Але сапраўдны росквіт творчасці гэтага выдатнага мастака пачаўся з таго часу, калі зарадзіўся мастацкі тэатр, які карыстаецца зараз, як і яго аснавальнік К. С. Станіслаўскі, сусветнай славай.

Станіслаўскі з першых-жа крокаў абвясціў лютую вайну хлусліваму штампу сталічных і правінцыяльных тэатраў, іх фальшываму ўспрыйманню жыцця. Ён пачаў змагацца за культуру тэатра, пачаў старанна, з вялікім адборам складаць рэпертуар. Наватарскія прыёмы Станіслаўскага былі сустрэты інакшмыслячымі недаверлівa, непрыязна. Але сіла Канстанціна Сергеевіча была і ёсць у тым, што на працягу сваёй многалетняй тэатральнай дзейнасці ён з незвычайнай упартасцю абараняе прынцыпы, у якіх пераконан. Ніякія злобныя зазіды, — а іх на яго долю выпала ў праклятыя часы царызма нямала,—не збівалі Станіслаўскага, а наадварот — умацоўвалі яго мастацкія погляды і планы.

Быў у тэатры ў свой час ухіл у бок натуралізма. Гэта выражалася ў тым, што замест, скажам, дэкаратыўных, размаляваных дзвярэй ставілі сапраўдныя дубовыя дзверы. У «Власти тьмы», напрыклад, на сцэне з'явіўся жывы конь. Перажыў МХАТ і захапленне ўмоўным і сімвалічным тэатрам. Але чуццё мастака падказала Станіслаўскаму верны шлях, і ён нарэшце зразумеў, што тэатральнае мастацтва можа быць заснавана толькі на глыбокім рэалізме.

Растлумачу гэта на прыкладзе. Шмат гадоў таму назад Станіслаўскага, працаваўшага з акцёрамі, цікавіў у першую чаргу знадворны бок спектакля: афармленне, грым, паходка, гарнітур, манера трымаць сябе. Высветліўшы гэтыя дэталі, ён прымаўся, калі так можна сказаць, за «духоўны» бок. Зараз у яго падыход зусім іншы. Калі, скажам, я рэпетырую роль гараднічага ў «Ревизоре», ён гаворыць мне:

— Ідзіце ад сябе, не іграйце гараднічага, а ўявіце сябе на яго месцы, — як-бы вы, Леанідаў, рабілі ў тых акалічнасцях, якія прапануе вам аўтар,—а пасля ўжо, калі вы гэта адчуеце, шукайце паходку, грым, гарнітур.

Пры гэтым Станіслаўскі прадастаўляе акцёру поўную творчую свабоду. Але ён не перастае патрабаваць ад акцёраў, каб яны на сцэне былі заўсёды мастацка праўдзівымі, не фальшывілі, інакш заміж сцэнай і глядзельнай залай не будзе кантакту. Гэта прымушае акцёра мысліць, фантазіраваць, аглядаць увесь мінулы шлях таго героя, якога ён паказвае ў спектаклі. Дзякуючы такому рэжысёрскаму патрабаванню, вобраз, вылеплены акцёрам, робіцца больш поўным, праўдзівым, больш жыццёвым.

Сіла і поспех Станіслаўскага ў тым, што ён з'явіўся законным наступнікам і прадаўжальнікам лепшых традыцый рускага класічнага тэатра, стварыўшага школу мастацкага рэалізма. Імя Станіслаўскага стаіць у адным радзе з імёнамі Шчэпкіна, Салоўскага і іншых карыфеяў тэатра, створанага рускім народам. Блізасць да народа, да перадавых, прагрэсіўных яго колаў вызначыла рост МХАТ і самога Станіслаўскага. Ён ішоў па правільнай лініі, калі ішоў у нагу з Чэхавым і Горкім. І велізарны поспех МХАТ у совецкага гледача, заслужаная папулярнасць Станіслаўскага аснаваны на сувязі тэатра і яго кіраўніка з совецкім народам, з совецкім мастацтвам, з совецкай сацыялістычнай культурай.

У кнізе «Маё жыццё ў мастацтве» Станіслаўскі гаворыць, што пасля першай-жа гутаркі з Неміровічам-Данчэнка ён адразу падпарадкаваўся яго аўтарытэту ў пытаннях літаратуры. Гэта, зразумела, не азначае, што Станіслаўскі стаяў у баку, калі справа ішла аб выбары п'ес. Вядома, як глыбока паніў Чэхаў Станіслаўскага, якое, я сказаў-бы, узаемнае абажанне адчувалі яны адзін да другога. Таксама чуллівымі былі ўзаемаадносіны Станіслаўскага з Максімам Горкім.

Дружба Мастацкага тэатра з Горкім асабліва ўмацавалася ў апошнія гады. Калі Горкі гутарыў з кім-небудзь аб мастацкім тэатры, ён так і гаварыў: «У **нашым** тэатры», «мы павінны зрабіць тое і тое», «мы сыграем». Дарэчы тут працытаваць пісьмо Горкага да Чэхава аб першым знаёмстве з МХАТ'ам. «Мастацкі тэатр,—пісаў Алексей Максімавіч у 1900 годзе, — гэта таксама добра і значна як Трэцьякоўская галерэя, Васілій Блажэнны і ўсё самае лепшае ў Маскве. Не любіць яго — немагчыма, не працаваць для яго — злачынства...».

Зусім нядаўна МХАТ адсвяткаваў скромны юбілей — 35-годдзе з дня першай пастаноўкі п'есы М. Горкага «На дне». Поспех гэтага спектакля ў 1902 годзе і ў наступныя годы быў ашаламляючы. Малады Горкі ўпершыню паказаў людзей няшчасных, абіждоленых, скалечаных эксплаататарскім ладам, але якія гавораць аб сваіх пакутах з пачуццем чалавечай годнасці. Царская цэнзура, баючыся рэволюцыйнага ўздзеяння горкаўскай п'есы, спрабавала забараніць яе пастаноўку. Даз вол быў дадзен у надзеі, відаць, на тое, што п'еса праваліцца. Але прам'ера горкаўскай п'есы прайшла з грандыёзным поспехам. К. С. Станіслаўскі, Вл. І. Неміровіч-Данчэнка і артысты без канца выходзілі на выклікі публікі. Горкага глядзельная зала вітала асабліва бурна.

Калектыў Мастацкага тэатра заўсёды быў горды ўвагаю да яго Алексея Максімавіча. Таму пастанова ўрада аб прысваенні МХАТ'у імя вялікага пісьменніка Горкага была сустрэта ўсім калектывам тэатра з вялікім уздымам і радасцю.

Старасць перашкаджае Станіслаўскаму прымаць цяпер штодзенны актыўны ўдзел у работах тэатра. Але ён, як і даўней, повен духоўных сіл і энергіі і няўтомна прадаўжае працаваць над удасканаленнем «сістэмы» акцёрскага выхавання. У мінулым годзе мы сустраліся з ім у доме адпачынку. Станіслаўскі быў тады хворы на запаленне лёгкіх, у яго быў жар, але ў руках ён трымаў сшытак, у якім увесь час рабіў запісы. Гэтыя запісы калі-небудзь складуць новую кнігу, якая ўсебакова пазнаёміць акцёра з так званай «сістэмай Станіслаўскага». Залатыя крупінкі гэтай «сістэмы» ўжо зараз сталі здабыткам шырокіх акцёрскіх мас. Імі кіруюцца і старыя акцёры, на іх падставе рыхтуюцца маладыя кадры ў тэатральных навуковых установах. «Сістэма Станіслаўскага» запвярджае сацыялістычны рэалізм у мастацтве і, у прыватнасці, у тэатры, кліча майстроў сцэны да мастацка-праўдзівага раскрыцця вобразаў. Гэтая «сістэма» дазволіць нашым тэатрам ва ўсёй шырыні і рознастайнасці раскрыць глыбокі сэнс нашай совецкай рэчаіснасці.

Майстэрства Мастацкага тэатра па вартасці ацэнена совецкім гледачом. Ён любіць МХАТ за тое, што гэты тэатр знаёміць яго з лепшымі творамі класічнага мастацтва. Ён любіць гэты тэатр і за тое, што МХАТ у радзе сучасных п'ес з вялікай мастацкай сілай уваскрашае гераічныя карціны перыяду грамадзянскай вайны і раскрывае сацыяльны сэнс нашай совецкай рэчаіснасці. Совецкі гледач радуецца поспехам Мастацкага тэатра, і калі леташняя паездка МХАТ за граніцу завяршылася выключным трыумфам — гэта падзея ператварылася ў свята ўсяго совецкага мастацтва.

Партыя, урад з першых дзён Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі акружылі чуллівымі клопатамі калектыў Мастацкага тэатра. МХАТ узнагароджан ордэнам Леніна. Высокую ўзнагароду заслужыў і народны артыст Саюза ССР К. С. Станіслаўскі. У 1933 годзе ён атрымаў ордэн Прапоўнага Чырвонага Сцяга «за выключныя заслугі і многалетнюю дзейнасць у галіне мастацтва, у прыватнасці тэатральнага, і падрыхтоўку новых кадраў работнікаў сцэны». У 1937 годзе Станіслаўскі ўзнагароджан ордэнам Леніна. Прымаючы ордэн, ён заявіў: «...Усе сілы, усе дні свайго жыцця я аддам творчай рабоце, аддам падрыхтоўцы тэатральнай моладзі».

Гэтае сваё абяцанне Станіслаўскі праводзіць у жыццё ўпарта, настойліва, няўтомна.

Жыццё Канстанціна Сергеевіча Станіслаўскага поўна працы і натхнення. І сёння, у дзень свайго 75-годдзя, ён з гонарам аглядае пройдзены шлях і глыбока пераконваецца, як пры гарачай дапамозе комуністычнай партыі і совецкага ўрада ажыццяўляюцца яго мастацкія ідэалы. Ён, па праву, носіць высокую і ганаровую назву народнага артыста Саюза ССР, бо створаны ім Мастацкі тэатр стаў у нашы годы сапраўды народным, стаў мастацкай скарбніцай сацыялістычнай дзяржавы, пястуемай усім народам. Совецкая грамадскасць жадае К. С. Станіслаўскаму здароўя і сіл, якія-б дазволілі яму яшчэ на працягу доўгіх год быць узнёслым і сведкай далейшага росту совецкага мастацтва.

Л. ЛЕАНІДАЎ,
народны артыст Саюза ССР, ордэнаносец.

УРАДАВЫ КРЫЗІС У ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 15 студзеня. (БЕЛТА). У сувязі з урадавым крызісам у Францыі і перагаворамі аб сфармаванні новага кабінета, рэакцыйныя колы крычаць аб расколе народнага фронта і адначасова усяляк расхвальваюць былога міністра фінансаў, правага радыкала Бонэ, вітаючы яго спробу сфармаваць новы ўрад.

Сярод радыкал-сацыялістаў няма аднадушнасці. Правыя радыкалы патрабуюць стварэння кабінета радыкалаў з удзелам правых цэнтрыстаў Рэно і Фландэна. Яны выходзяць з заяў Фландэна аб тым, што яго партыя з'яўляецца «правым крылом радыкал-сацыялісцкай партыі» і са зробленай ім на пасяджэнні палаты ад 13 студзеня прапановы аб супрацоўніцтве з радыкаламі.

Пазіцыя левых радыкалаў характарызуецца наступнай заявай аднаго з ранейшых віцэ-старшынь радыкал-сацыялісцкай партыі Жана П'ю на старонках газеты «Эвр»: «Ці можна ўявіць сабе стварэнне ўрадавай большасці, якая выключала-б падтрыманне або ўдзел адной з груп, разам выбраных у 1936 годзе? Я не веру ў гэта».

Сацыялістычная партыя патрабуе стварэння ўрада народнага фронта з сацыялістычным кіраўніцтвам. Кіраўніцтва сацыялістычнай партыі прыняла рэзалюцыю, у якой выражае «адданасць праграме і палітыцы народнага фронта».

Парламенцкая група сацыялістычнай партыі прыняла аднагалосна рэзалюцыю, у якой гаворыць: «Сацыялістычная група, якая прадстаўляе сабой самую значную групу парламенцкай большасці, мае права і абавязана патрабаваць кіруючай ролі ва ўрадзе».

Пазіцыя компартыі паказана ў заяве Палітбюро компартыі, аб якой паведамлялася ўжо, а таксама ў выступленні генеральнага сакратара компартыі Морыса Торэза ў Іўры. «Як у 1926 і ў 1934 гг., — заявіў Торэз, — рэакцыя пралюбымае лютую атаку на дзяржаўныя фінансы, каб навязаць сваю волю краіне, наперакор народнаму галасаванню. У гэтых умовах урадавая дэкларацыя, зробленая ў палаце дэпутатаў, выклікае ў народных масах законнае хваляванне. На самой справе, як вытлумачыць, што атакі і пагрозы маглі быць накіраваны супроць рабочага класа і рабочай прафсаюзнай арганізацыі, Усеагульнай канфедэрацыі працы, у той час, як нічога не было сказана супроць пана Жын'ю, які на чале канфедэрацыі прадпрыемцаў робіць усё, каб сабатаваць сацыяльнае заканадаўства і выклікаць хваляванні ў краіне. Таму мы заявілі з трыбуны палаты дэпутатаў і патрабавалі, каб былі прыменены энергічныя меры супроць арганізатараў фінансавай панікі».

Тав. Рамет заявіў, што наша група не будзе галасаваць супроць рэзалюцыі даверыя ўраду ў мэтах захавання адзінства народнага фронта. Не гледзячы на гэта, Шатан прадпрыняў атаку, меўшую мэтай выключыць комуністаў з парламенцкай большасці. Да гэтага трэба дадаць некалькі слоў адносна пазіцыі міністраў-сацыялістаў, якія, вышаўшы ў адстаўку, выклікалі ўрадавы крызіс і пайшлі, такім чынам, у другі раз на ўступку рэакцыі замест таго, каб аказаць супраціўленне атакам рэакцыйных колаў.

У даны момант гутарка ідзе аб тым, каб забяспечыць ажыццяўленне праграмы народнага фронта згодна жаданням народа, якія пацверджаны рэзультатамі апошніх кантанальных выбараў. Воля народа павінна быць выканана. Гэта значыць, што павінен быць створан урад па ўзору народнага фронта для ажыццяўлення яго праграмы. Комуністычная партыя зробіць усё для ажыццяўлення волі нацыі і забеспячэння хлеба, свабоды і міру».

Згодна цыркулюючых у палітычных колах чуткаў, Бонэ даў канчатковую згоду на сфармаванне кабінета. У якасці магчымага міністра замежных спраў называюць Шатана, міністра юстыцыі — Дэльбоса і ваеннага міністра — Даладзе.

***

ПАРЫЖ, 16 студзеня. (БЕЛТА). У сувязі з урадавым крызісам орган компартыі «Юманітэ» атрымлівае ад розных арганізацый рабочага класа зялікую колькасць рэзалюцый з патрабаваннем стварыць урад народнага фронта, які выканаў-бы яго праграму.

Камітэт народнага фронта Парыжскага раёна, які яднае 96 арганізацый, налічваючых паўтара мільёна членаў, выражае ў сваёй рэзалюцыі цвёрды намер зрабіць усё неабходнае для неадкладнага ажыццяўлення праграмы народнага фронта. Перад тварам фашысцкай пагрозы Камітэт заклікае ўсіх прыхільнікаў свабоды і міру падтрымаць адзінства народнага фронта.

Федэрацыя прафсаюзаў хімічных прадпрыемстваў, якія яднаюць 180 тысяч членаў, прафсаюзная арганізацыя заводаў Рэно, якая яднае 40 тысяч рабочых, аб'яднанне прафсаюза рабочых комунальных прадпрыемстваў ад імя 120 тысяч членаў паслалі прэзідэнту рэспублікі тэлеграмы і пісьмы з патрабаваннем стварыць урад народнага фронта, здольны энергічна абараняць дэмакратычныя свабоды.

***

ПАРЫЖ, 16 студзеня. (БЕЛТА). Па чутках, Бонэ імкнецца стварыць аднародны кабінет, які складаецца з радыкалаў. Сацыялісты на прапанову Бонэ ўступіць у кабінет адказалі адмаўленнем, даўшы зразумець, што ўзначальваемы ім урад не можа разлічваць не толькі на падтрыманне сацыялістаў, але і на ўстрымане сацыялістаў ад галасавання супроць кабінета.

На ўчарашнім пасяджэнні дэлегацыі левых груп палаты дэпутатаў прынята рэзалюцыя, у якой дэлегацыя з задаваленнем адзначае, што ўсе ўваходзячыя ў яе групы выказаліся за ўтварэнне ўрада народнага фронта, поўнага рашучасці ажыццявіць праграму апошняга.

Учора на мітынгу ў Парыжы выступіў комуністычны дэпутат і віцэ-старшыня палаты дэпутатаў Жак Дзюкло. Дзюкло заявіў, як паведамляе агенцтва Гавас, што комуністычная партыя «гатова прыняць на сябе адказнасць ва ўрадзе народнага фронта».

***

ПАРЫЖ, 16 студзеня. (БЕЛТА). Па апошніх вестках сфармаванне новага французскага ўрада прыняў на сябе лідэр сацыялістычнай партыі Леон Блюм.

У Японіі расце незадаволенне шырокіх мас вайной, зацеянай японскімі мілітарыстамі супроць Кітая. Паліцыя жорстка праследуе антываенныя настроі працоўных. **На здымку:** арышт японскай паліцыяй удзельнікаў нелегальнага рабочага схода. (СФ).

ЗАРУБЕЖНЫЯ ВОДГУКІ
НА ПЕРШУЮ СЕСІЮ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 15 студзеня. (БЕЛТА). Друк прадаўжае змяшчаць інфармацыю пра Сесію Вярхоўнага Совета СССР. «Юманітэ» публікуе падрабязную справаздачу аб выступленні таз. Берыя.

Газеты «Эр нувель» і «Юманітэ» прыводзяць справаздачы аб дакладзе Мандатнай Камісіі. «Эр нувель» адзначае пры гэтым малады склад вышэйшага заканадаўчага органа Совецкага Саюза, указваючы, што «больш паловы складу Совета Саюза — за ўзросце маладзей 40 год, пяцера-ж — ва ўзросце 20 год і адной дэпутатцы толькі што споўнілася 19 год».

АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 15 студзеня. (БЕЛТА). Маскоўскія карэспандэнты газет: «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост», «Дэйлі геральд» і «Манчэстэр гардзіан» у сваіх паведамленнях аб дакладах Мандатных Камісій Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей асабліва падкрэсліваюць малады склад дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР. Карэспандэнт газеты «Дэйлі геральд» заўважае: «Самым маладым членам самага маладога парламента ў свеце з'яўляецца 19-гадовая работніца Клаўдзія Сахарава».

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 15 студзеня. (БЕЛТА). Усе пражскія газеты друкуюць падрабязныя паведамленні аб ходзе работ Вярхоўнага Совета СССР пад загалоўкамі: «Вярхоўны Совет Саюза ССР засядае» «Праграма работ Вярхоўнага Совета», «Совецкі Саюз гарантуе мір усяму чалавецтву» і т. д. У паведамленнях прыводзіцца змест выступленняў дэпутатаў Вярхоўнага Совета. Адначасова газеты публікуюць інфармацыю аб адбыўшыхся ў розных гарадах СССР сходах рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі, вітаўшых адкрыццё Сесіі вярхоўнага органа Совецкага Саюза.

ШВЕЙЦАРЫЯ

ВЕНА, 15 студзеня. (БЕЛТА). Швейцарскія газеты падрабязна асвятляюць работу Сесіі Вярхоўнага Совета Саюза ССР. Базельская «Нацыяналь цэйтунг» пад загалоўкам «Вялікае свята народаў Совецкага Саюза» паведамляе аб адкрыцці і ходзе работ Сесіі.

Орган швейцарскай компартыі «Фрэйхейт» пад загалоўкам «Работа Вярхоўнага Совета» піша: «Работа Вярхоўнага Совета праходзіць з такой-жа аднадушнасцю, як і выбары ў Вярхоўны Совет. Заканадаўства Совецкага Саюза мае адну мэту: служыць народу. Кожны дэпутат мае перад сабой жывы прыклад ў асобе першага дэпутата Вярхоўнага Совета таварыша Сталіна».

ЯПОНІЯ

ТОКІО, 14 студзеня. (БЕЛТА). Усе газеты прыводзяць паведамленне агенцтва Домей Цусін аб другім пасяджэнні Совета Саюза, асабліва адзначаючы стварэнне Камісіі па замежных справах на чале з тав. Жданавым. Газета «Асахі» прыводзіць выступленне тав. Берыя наконт няўхільнай мірнай палітыкі СССР.

Заява Чан Кай-шы

ЛОНДАН, 15 студзеня. (БЕЛТА). У гутарцы з карэспандэнтам агенцтва Рэйтэр пры палязным штабе кітайскіх войск Чан Кай-шы заявіў: «Я абучаю новую армію. Патрабуецца два месяцы для перабудовы дывізій, якія змагаюцца на фронце. Наша супраціўленне не будзе канцэнтравацца толькі ў адных важных пунктах абароны. Мы скарыстаем размеры нашай краіны, каб безупынныя атакамі трымаць японцаў у пастаянным напружанні. Мы будзем прадаўжаць барацьбу да канца».

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

На тэруэльскім фронце — лёгкая ружэйная перастрэлка. Рэспубліканцы занялі некалькі пазіцый на поўнач ад Селадас (на паўночны ўсход ад Тэруэля).

Рэспубліканскія самалёты бамбардыравалі рад вакзалаў мяцежнікаў, знішчылі склады зброі.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

На фронце Мадрыда, у раёне Барыдэль Пероль, рэспубліканскія войскі ўзарвалі міну. Мяцежнікі страцілі забітымі больш 50 чалавек. Скарыстаўшы замяшанасць мяцежнікаў, рэспубліканцы атакавалі фашысцкія пазіцыі. Мяцежнікі вымушаны былі выклікаць падмацаванні. Рэспубліканскія часці, выканаўшы заданне, вярнуліся на свае пазіцыі.

На іншых франтах нічога істотнага.

***

15 студзеня фашысцкая авіяцыя двойчы бамбардыравала Барселону.

ПІЛЬНЫ ВАРТАВЫ

Чырвонаармейцу Ф. І. Крывашэеву з падраздзялення, якім камандуе старшы лейтэнант тав. Грынько, было даручана нясенне каравульнай службы на адным з адказных пастоў. Права на нясенне каравульнай службы на гэтым участку тав. Крывашэеў заваяваў добрымі паказальнікамі ў сваёй вучобе і рабоце. Ён на працягу сваёй службы атрымаў некалькі падзяк.

На пасту, калі найшла змена, тав. Крывашэеў успомніў словы камандзіра падраздзялення: «Вам зышла вялікая адказная задача, глядзіце-ж, не падвядзіце», і рукі мацней сціснулі вінтоўку, заражаную баявымі патронамі. Вочы напружана ўтлядаліся ў начную цемру.

Раптам удалі паказалася некалькі сілуэтаў. Тав. Крывашэеў адразу-ж іх заўважыў і пачаў уважліва сачыць. Невядомыя ўсё больш набліжаліся, не заўважаючы замаскіраванага чырвонаармейца. Іх было 6 чалавек. Калі невядомыя падышлі зусім блізка, зоркі вартавы хутка выскачыў і скамандаваў: «Стой», «Рукі ўверх». Двое імкнуліся ўцякаць, але тав. Крывашэеў выстраліў і прымусіў іх спыніцца і падняць рукі ўверх. На выстрал хутка прыбег каравул. Невядомыя былі дастаўлены ў штаб часці. Высветлілася, што яны імкнуліся зрабіць дыверсійны акт.

За добрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў і праяўленую пільнасць і смеласць на пасту камандаванне часці ўзнагародзіла тав. Крывашэева грашовай прэміяй і сфатаграфавала яго пад баявым сцягам часці.

А. КІРЫЛАЎ.

РЫХТУЮЦЦА ДА ЛЕНІНСКІХ ДЗЁН

Рабочы калектыў завода імя Молатава (Менск) узмоцнена рыхтуецца да ленінскіх дзён. Выдучаныя агітатары праводзяць у цэхах гутаркі на тэму «14 год без Леніна па сталінскаму шляху».

На заводзе арганізавана зыстаўка, якая аллюстроўвае жыццё і дзейнасць вялікага генія чалавецтва В. І. Леніна.

***

ЖЛОБІН. Дзіцячы харавы гурток жлобінскага чыгуначнага клуба ў складзе 80 дзяцей актыўна рыхтуецца да ленінскіх дзён. На вечары памяці Ільіча гурток выканае мантаж «14 год без Леніна па ленінскаму шляху».

ХРОНІКА

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР назначыў тав. **Нозікава** Івана Антонавіча першым намеснікам народнага камісара аховы здароўя БССР.

Прэзідыум ЦВК БССР назначыў тав. **Выхадцава** Віктара Ільіча першым намеснікам наркома ўнутранага гандлю БССР.

ПРЭМІІ ЗА ВЫДАТНУЮ РАБОТУ

Згодна загада Народнага камісарыята шляхоў зносін, за выдатную работу — без адзінай аварыі на працягу 1937 года, — прэміраваны месячным акладам тт. Марынін і Маляўка—саставіцелі паяздоў станцыі Менск-пасажырская.

Атрымалі наркомаўскую прэмію — месячны аклад — стрэлачнікі гэтай-жа станцыі тт. Якубовіч, Вальковіч, Чыстапянаў, Шостак і Чарнавусік.

НОВЫЯ РАБОТЫ МАСТАКА Я. М. КРУГЕРА

Старэйшы ў БССР мастак Якаў Маркавіч Кругер, не гледзячы на свае 70 год, прадаўжае весці вялікую творчую работу. З работ, прадстаўленых ім на нядаўна закрыўшайся выстаўцы «БССР за 20 год», асабліва добрую ацэнку атрымаў партрэт Максіма Горкага. У творчым плане мастака на гэты год — тры работы. Першая з іх — вялікі партрэт таварыша Сталіна. Адначасова тав. Кругер збірае дакументальны матэрыял, фото для стварэння партрэта кандыдата беларускага народа ў Вярхоўны Совет СССР жалезнага наркома абароны таварыша К. Е. Варашылава. Імжа будзе зроблен партрэт Героя Совецкага Саюза акадэміка О. Ю. Шмідта.

СУДОВАЯ ХРОНІКА

Красільнікава А. Д. трымала ў сябе на кватэры (па Калектарнай вуліцы, у доме № 15) прытон распусты. Красільнікава ўцягвала ў свой прытон малалетніх дзяцей, а таксама прывучала іх рабіць пакражы.

Актыўным натхніцелем і саўдзельнікам у гэтых злачынствах быў Язвінскі Ф., без пэўных заняткаў, з цёмным мінулым.

Нарсуд 4 участка прыгаварыў Красільнікаву да трох год пазбаўлення волі і Язвінскага — да 5 год пазбаўлення волі.

ЗВЫШМАГУТНЫЯ ПАРАВОЗЫ „ІС" НА ЗАХОДНЯЙ ЧЫГУНЦЫ

Паравознае дэпо станцыі Орша першае на Заходняй чыгунцы атрымала для пасажырскіх паязлоў 5 звышмагутных паравозаў маркі «Іосіф Сталін» («ІС»).

Для вывучэння машын тры машыністы-крываносаўцы, тры слесары і адзін брыгадзір выехалі ў Маскву на 25-дзённы курсы, каб пасля курсаў яны змаглі самастойна працаваць на гэтых паравозах.

Звышмагутныя паравозы «ІС» будуць весці пасажырскія паязды, якія курсіруюць па магістралі Негарэлае—Масква.

ПЕРШЫМІ ВЫКАНАЛІ ПЛАН ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ЛЕСА

Калгаснікі калгаса «Пагранічны маяк», Прудзянкоўскага сельсовета, Дрысенскага раёна, першымі выканалі план загатовак і вывазкі лесаматэрыялаў. Для выканання гэтай важнейшай работы калгаснікі ва сваім агульным схоўзе вылучылі спецыяльную брыгаду з лепшых калгаснікаў. Ім былі вылучаны больш моцныя коні. Брыгада, разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва, датэрмінова выканала план лесазагатовак на 115 проц. і план вывазкі—на 130 проц.

ДАДЗЕКА.

МЕНСК—МАСКВА НА ЛЫЖАХ

Менскі райваенкамат і гарадскі камітэт фізкультуры арганізоўваюць лыжны пераход па маршруту Менск—Масква, прысвечаны 20-годдзю РСЧА і ваенна-морскага флота.

У пераходзе прымуць удзел 20 лепшых фізкультурнікаў-дапрызыўнікаў, рабочых і калгаснікаў горада і раёна. Усе яны здалі нормы на варашылаўскага стралка і ГПА. У дарозе, на астаноўках лыжнікі будуць праводзіць гутаркі ў калгасах і на прадпрыемствах аб 20-годдзі РСЧА.

Старт на Маскву 6 лютага.

—о—

КОРАТКА

⊙ У Оршы адбыўся **выпуск аднагадовых акушэрскіх курсаў.** Вучобу закончылі 32 чалавекі. Усе яны накіроўваюцца працаваць на калгасных медыцынскіх пунктах Аршанскага, Талачынскага і іншых раёнаў.

⊙ На швейнай фабрыцы імя Валадарскага ў Магілеве **закончана будаўніцтва новай рабочай сталовай.** Прапускная здольнасць сталовай — 800 чалавек у дзень.

⊙ У калгасе «Чырвоныя Гарбацэвічы», Аршанскага раёна, **абсталёван калгасны радыёвузел.** 40 дамоў калгаснікаў радыёфікаваны. Кожны вечар калгаснікі слухаюць навіны па радыё з Масквы, Менска, Ленінграда і іншых гарадоў Саюза.

⊙ Агітбрыгада Цэнтральнага Совета саюза ваяўнічых бязбожнікаў і ЦК МОПРа БССР арганізавалі ў клубе мястэчка Зембіна, Барысаўскага раёна, вялікі антырэлігійны і інтэрнацыянальны вечар. Прысутнічала каля 700 чалавек. Былі зроблены даклады «Сталінская Канстытуцыя і барацьба з рэлігіяй» і аб міжнародным становішчы. Пасля дакладаў дэманстравалася карціна «Зварот Максіма».

Намеснік адказнага рэдактара
І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Беларускі Дзяржаўны Драматычны тэатр
17 студзеня Абан. № 96
АПОШНІЯ

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
1) ПРАМОВА таварыша МОЛАТАВА аб выбарчым блоку комуністаў і беспартыйных.
2) «БЯЛЕЕ ПАРУС АДЗІНОКІ»

Кінотэатр «Пролетарый»
ЛЕНІН У КАСТРЫЧНІКУ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
1) ВЯСЕЛЫЯ ПАДАРОЖНІКІ
2) ЦУДОЎНЫ КАРАБЛЬ

Гукавы кінотэатр «інтэрнацыянал»
ЖЫЦЬ

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ЮНАСЦЬ

У МАГАЗІНАХ І КІЁСКАХ КОГІЗ'а ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ ЛІТАРАТУРА ДА ЛЕНІНСКІХ ДЗЁН

(на рускай мове)

І. В. СТАЛІН — Аб Леніну. Партыдат. Цана 20 кап.
УЛЬЯНАВА-ЕЛІЗАРАВА — В. І. Ульянаў (Ленін) Кароткі нарыс жыцця і дзейнасці. Партыдат. Цана ў пер. 1 р. 40 кап.
Н. К. КРУПСКАЯ — Ленін і партыя. Партыдат. Цана ў пер. 1 руб.
Н. К. КРУПСКАЯ — Будзем вучыцца працаваць у Леніна. Партыдат. Цана 1 руб. 35 кап.
КЛАРА ЦЭТКІН — Успаміны аб Леніну. Партыдат. Цана 45 кап.
ЯРАСЛАЎСКІ Ем. — Біяграфія Леніна. Партыдат. Цана 65 кап.
КЕРЖЭНЦЭЎ — Жыццё Леніна. Партыдат. Цана 1 руб. 10 кап. (у пераплёце).
В. В. АДАРОЦКІ — Успаміны аб Леніну. Партыдат. Цана 50 кап.
ВАРАШЫЛАЎ — Ленін, Сталін і Чырвоная Армія. Партыдат. Цана 60 кап.
ЛЕНІН — Што такое «друзья народа» і як яны ваюць супроць социял-дэмакратаў. Партыдат. Цана 2 руб.
ЛЕНІН — Што рабіць. Партыдат. Цана 1 руб. 75 кап.
ЛЕНІН — Аб дзяржаве. Партыдат. Цана 10 кап.
ЛЕНІН — Імперыялізм як вышэйшая стадыя капіталізма. Партыдат. Цана 1 руб. 30 кап. (у пераплёце).
ЛЕНІН — Красавіцкія тэзісы. Партыдат. Цана 35 кап.
ЛЕНІН — Чарговыя задачы Совецкай улады. Партыдат. Цана 20 кап.
ЛЕНІН — Вялікі пачын. Партыдат. Цана 15 кап.
ЛЕНІН — Аб «левым» рабячстве і аб дробна-буржуазнасці. Партыдат. Цана 25 кап.
ЛЕНІН — Аб электрыфікацыі. Партыдат. Цана 40 кап.
ЛЕНІН — Збор твораў у 30 тамах. III выданне. Праводзіцца продаж асобных тамоў. Цана 3 руб. 30 к. за том.
ЛЕНІН — Выбраныя творы ў 2-х тамах. Цана за два тамы ў пераплёце 9 руб.
І. В. СТАЛІН — Пытанні ленінізма. Выд. 10-е. Цана ў пер. 3 руб. 25 кап.
І. В. СТАЛІН — Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне. 1937 г. Партыдат. Цана ў пер. 2 руб.
І. В. СТАЛІН — Аб індустрыялізацыі краіны і аб правым ухіле ў ВКП(б). Партыдат. 1937 г. Цана 20 кап.
І. В. СТАЛІН — Даклад аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР і Канстытуцыя СССР. Партыдат. Цана 30 кап.
І. В. СТАЛІН — Прамова на першай усесаюзнай нарадзе стахановцаў. Партыдат. Цана 10 кап.
І. В. СТАЛІН — Прамова на першым усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў. Партыдат. Цана 10 кап.
І. В. СТАЛІН — Прамова на перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі г. Масквы 11-XII—37 г. Партыдат. Цана 10 кап.
І. В. СТАЛІН — Аб недахопах партыйнай работы і мерах ліквідацыі трацкісцкіх і іншых двурушнікаў. Даклад і заключнае слова на Пленуме ЦК ВКП(б) 3—5 сакавіка 1937 г. Партыдат. 1937 г. Цана 20 кап.
СТЭЦКІ — Сталінская Канстытуцыя — увасабленне ідэй Леніна. Партыдат. Цана 20 кап.
АБ КАНСТЫТУЦЫІ САЮЗА ССР. Зборнік. Партыдат. Цана ў пер. 65 кап.
В. М. МОЛАТАЎ — Аб стахановскім руху і культурнасці рабочага класа. Партыдат. Цана 10 кап.
В. М. МОЛАТАЎ — Да 20-годдзя Кастрычніцкай рэволюцыі. Даклад на ўрачыстым пасяджэнні ў Вялікім тэатры 6 лістапада 1937 г. Партыдат. 1937 г. Цана 15 кап.
М. І. КАЛІНІН — Што дала совецкая ўлада працоўным. Партыдат. Цана 15 кап.
НАША РАДЗІМА. Партыдат. Цана 1 руб. 25 кап. (у пераплёце).
ССР І КРАІНЫ КАПІТАЛІЗМА. Партыдат. Цана 80 кап.
ЯК РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ ЗАВАЯВАЛІ ЎЛАДУ І ПАБУДАВАЛІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ ГРАМАДСТВА. Партыдат. Цана ў пер. 65 кап.
АБ МЕТАДАХ І ПРЫЕМАХ ЗАМЕЖНЫХ РАЗВЕДЧЫХ ОРГАНАЎ І ІХ ТРАЦКІСЦКА-БУХАРЫНСКАЙ АГЕНТУРЫ. Зборнік Партыдат. 1937 г. Цана ў пер. 1 руб. 75 кап

УВАГА! Усе кніжныя магазіны і кіёскі КОГІЗ'а ПРАДАЮЦЬ ДАКЛАД ТАВАРЫША СТАЛІНА на Надзвычайным VIII З'ездзе Советаў, запісаны на грамафонных пласцінках. Цана камплекта — 21 руб. Цана ў альбоме — 77 руб. 40 кап.
Заказы поштай пасылайце па адрасу: г. Менск, Совецкая, 50. «КНІГА-ПОЧТАЙ».
БЕЛАДДЗЯЛЕННЕ КОГІЗ'а.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА АДНАГА ДОВЫЯ КУРСЫ СЯСЦЕР АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ (АЗД І П) пры інстытуце АМД.
На 1 год навучання прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 35 год, скончыўшыя сямігодку. Усе прынятыя забяспечваюцца стыпендыяй па паспяховасці, іншагароднія атрымліваюць кватэрныя. Інтэрната няма. Жадаючыя паступіць на 1 год навучання могуць з усімі дакументамі прыязджаць 20 студзеня. Асобы, падаўшыя заявы раней і не атрымаўшыя паведамлення аб прыездзе на іспыты, могуць таксама прыязджаць 20 або 23 студзеня г. г. Іспыты праводзяцца па беларускай і рускай мовах, палітграмаце і матэматыцы. На 2-гі год навучання прымаюцца асобы, скончыўшыя аднагадовыя курсы сясцёр АЗД і П. Да заявы неабходна прыкласці даведку аб водпуску на вучобу з месца работы.
Прыём заяў асабіста і па пошце праводзіцца да 25 студзеня ў канцылярыі інстытута — г. Менск, Совецкая, 16, загадчыку курсамі.

Памяшканне Беларускага дзяржаўнага драмтэатра.
19 студзеня— адкрыты КАНЦЭРТ
БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ КАНСЕРВАТОРЫІ І МУЗЫКАЛЬНАГА ВУЧЫЛІШЧА.
У ПРАГРАМЕ: сімфанічны аркестр, хор, аркестр баяністаў, сольныя выступленні педагогаў і студэнтаў.
Пачатак канцэрта ў 8 гадзін вечара.
Білеты прадаюцца ў касе тэатра і ў кансерваторыі.

Шукаю сына Паўла Цярэнцевіча Шнурэнка, 13 год, пакінутага ў 1933 г. у жлобінскай больніцы. Асоб, якія ведаюць аб яго месцы прабывання, прашу паведаміць па адрасу: Станіца Варэнікава, Темрэцкага раёна, Краснадарскага краю, Цярэнцію Хвядосаву Шнурэнка.

ВЫДАВЕЦТВУ «ЗВЯЗДЫ» ПАТРЭБНЫ
ГОРНАРАБОЧЫЯ І ПРЫБІРАЛЬНІЧКІ.
Даведацца: Совецкая, 63, 2 паверх, пакой № 2.

Адміністрацыя і калектыў сярэдняй сакратарскай школы выказваюць глыбокае спачуванне настаўніцы ГАЛУЗКІНАЙ з прычыны смерці яе БАЦЬКІ.

АДКРЫТА ПАДПІСКА
НА ШТОМЕСЯЧНЫ ЖУРНАЛ
„ЛИТЕРАТУРНАЯ УЧЕБА"
ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ
Асноваи у 1930 г. М. ГОРКІМ.
Журнал шырока асвятляе пытанні гісторыі літаратуры, літаратуразнаўства і крытыкі; ставіць сваёй задачай аказанне дапамогі пачынаючым пісьменнікам у іх творчай рабоце.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
1 год — 24 р.,
6 мес. — 12 р.,
3 мес. — 6 р.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА
ва ўсіх агенцтвах і аддзяленнях Саюздруку, ва ўсіх паштовых аддзяленнях і пісьманосцамі.
МАСКВА, Выд-ва «Совецкий писатель».

Зацверджана Прэзідыумам Менгорсовета ад 23 снежня 1937 г.

ПРАВІЛЫ І ПАРАДАК
КАРЫСТАННЯ МЕНСКІМ ГАРАДСКІМ ТРАМВАЕМ

1. Уваход у вагоны трамвая як маторныя, так і прычэпныя дазваляецца толькі праз заднюю пляцоўку.
2. Уваход праз пярэднюю пляцоўку маторнага вагона пры платным праездзе дазваляецца:
а) асобам з наяўнымі прызнакамі інваліднасці;
б) асобам з малымі дзяцьмі;
в) цяжарным жанчынам;
г) школьнікам да 12-гадовага ўзросту ў гадзіны пачатку заняткаў у школах.
3. Дазваляецца ўваход праз пярэднюю пляцоўку прычэпнага вагона з бясплатным праездам работнікам трамвая па асобых пасведчаннях і работнікам міліцыі толькі ў форме.
УВАГА: работнікі міліцыі без формы праязджаюць у вагонах трамвая на агульных падставах і за плату.
4. Праезд на пярэдняй пляцоўцы маторнага вагона дазваляецца толькі супрацоўнікам трамвая па асобых пасведчаннях у колькасці аднаго чалавека.
5. Члены і кандыдаты Менгорсовета і члены Менскага РВК карыстаюцца бясплатным праездам у трамваі.
6. Забараняецца:
а) праезд у трамваі асобам з вінтоўкамі, са стрэльбамі ў неразабраным выглядзе, з лыжамі, асобам з вялікім багажом, а жывёлай і небяспечнымі ад агню прадметамі, з рэчамі, маючымі злавонны пах ці пэцкаючымі вопратку пасажыраў, асобам у п'яным выглядзе і арыштаваным у суправоджэнні канваіраў;
б) высоўвацца з вокнаў і пляцовак у часе руху трамвая;
в) стаяць багаж. на скамейках;
г) шумець, пець, грацьь, курыць і плявацьь у вагонах;
д) прыводзіць у дзейнасць званкі, тормазы і інш. прыстасаванні вагона;
е) праезд на буферах і падножках;
ж) уваход і выхад у часе руху;
з) займаць месца, вызначанае для кандуктара.
7. Першыя 8 месц ад пярэдняй пляцоўкі ў маторным вагоне па абодвух баках павінны аслабяняцца для інвалідаў і для асоб з дзяцьмі.
8. Пры пасадцы ў вагон трамвая грамадзяне абавязаны захоўваць парадак.
9. Дзеці да 5 год, калі яны едуць у трамваі з бацькамі, праязджаюць бясплатна.
10. Дазваляецца правозіць бясплатна невялікі ручны багаж да 30 см. шырыні і 50 см. даўжыні. Багаж, які займае асобнае месца, дазваляецца правозіць у прычэпным вагоне з правам уваходу праз пярэднюю пляцоўку. За правоз указанага багажа бярэцца плата ў трайным размеры каштоўнасці пасажырскага білета.
11. Асобы, маючыя права праходу праз пярэднюю пляцоўку як маторнага, так і прычэпнага вагона, а таксама і права бясплатнага праезду, абавязаны прад'яўляць дакумент, не чакаючы запытання кантралёра, важатага і кандуктара.
12. У выпадку папсавання матэрыяльных частак вагона па віне пасажыраў, апошнія аплачваюць каштоўнасць страт згодна расцэнак.
13. З асоб, вінаватых у парушэнні гэтых правіл, спаганяецца кантралёрам, вагонаважатым або кандуктарам штраф да 3-х руб. Безбілетныя, акрамя штрафу, абавязаны купіць білет.
Пры адмаўленні ўплаціць штраф на месцы, начальнікам адпаведнага аддзялення міліцыі накладаецца на парушальніка штраф у трайным размеры.
14. Нагляд за выкананнем гэтых правіл усклада́ецца на Ментрамвай і РО міліцыю.

Старшыня горсовета ВАНЕЕВ.
Сакратар горсовета КАЗЛОЎСКІ.

Мясцком і калектыў работнікаў рэдакцыі і выдавецтва газеты «Звязда» выказваюць сваё спачуванне работніку выдавецтва «Звязда» тав. РАСКІНУ з прычыны смерці яго БАЦЬКІ.

Згублена круглая пячатка на імя халопеніцкай арцелі «Новы шлях». Лічыць несапраўдная. Змест пячаткі: Халопеніцкая кравецкая арцель «Новы шлях».

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; сакратарыята — 25-188, 20-830; аддзела партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21-846, культуры — 23-955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-885, ілюстрацыйнага і стылю рэдактуры — 21-556, абмену — 21-845.
Уп. Галоўлітбела № К—5414.
Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63.
Ю., Л., Б.